АЭС ДАСЦЬ КРАІНЕ ЭЛЕКТРАДАМЫ І ТРАНСПАРТ 3

ВЯСЛЯРНЫ КАНАЛ У БРЭСЦЕ ДЫКТУЕ КУЛЬТУРНУЮ МОДУ ГОРАДУ МС

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

24 ЛІПЕНЯ 2020 г.
ПЯТНІЦА
№ 142 (29256)

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

+TV ПРАГРАМА

ЦЫТАТА ДНЯ

Ігар ПЕТРЫШЭНКА, намеснік прэм'ер-міністра:

«Цеснае спалучэнне паміж адукацыяй і вытворчасцю — гэта вельмі важна. Мы павінны вучыць нашых студэнтаў таму, што запатрабавана на вытворчасці. Ісці на некалькі крокаў наперадзе. У краіне пастаянна ўдасканальваецца аснашчэнне прадпрыемстваў, з'яўляюцца новыя распрацоўкі. Ужо недастаткова мець толькі базавыя веды, якія набываліся некалькі гадоў таму, у тым ліку па рабочых спецыяльнасцях. І рабочы, і тэхнолаг павінны пастаянна павышаць сваю кваліфікацыю».

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Чалавек заўсёды важнейшы за грошы»

Пра гэта Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка заявіў учора на нарадзе з кіраўніцтвам эканамічнага блока краіны ў Мінску

«Мы сабраліся для таго, каб, нягледзячы на асаблівы перыяд для нашай краіны, не ўпусціць з-пад увагі найважнейшыя пытанні, ад якіх залежыць звычайнае, штодзённае жыццё нашых людзей, — абазначыў задачу сустрэчы Аляксандр Лукашэнка. — Выбарчая кампанія пройдзе, градус палітычных працэсаў знізіцца, і эканоміка зноў апынецца ў цэнтры грамадскай увагі, ды яна і зараз нікуды не знікае».



Фота БелТА.

Работа галін рэальнага сектара і сектара паслуг, фінансаў, сацыяльнай сферы павінна быць пад пільным кантролем, падкрэсліў ён.

«Ніводная шрубка ў гэтай машыне не павінна дапусціць збою. У пачатку года, падчас выпрабаванняў «нафтавай пандэміяй», нам гэта ўдалося. Затым была вірусная, «інфармацыйная». Цяпер пачалася «палітычная», — ахарактарызаваў сённяшні дзень Прэзідэнт. — Але наўрад ці гэта для некага нечаканасць. На лёгкія часы мы ніколі не разлічвалі. Разлічваць на іх нельга і надалей».

Аднак ключавая задача для Прэзідэнта і кіраўніцтва эканамічнага блока краіны — у іншым, падкрэсліў беларускі лідар. СТАР. 2

Мая радасць ты, лянок!

У Буда-Кашалёўскім раёне на плошчах Уваравіцкага льнозавода цярэбяць лён, які — шэсць сартоў — пасеяны тут больш чым на тысячы гектараў. Валакно сёлета, мяркуючы па тым, што трымае ў руках механізатар Сяргей ЯНАЧКІН, вырасла на славу.

Фота БелТА.

КАРАТКА

- **Мінадукацыі вызначыла графік школьных канікул у новым навучальным годзе.**
- ІІІ Форум рэгіёнаў Беларусі і Украіны пройдзе ў Гродне 8 і 9 кастрычніка.
- **У Рэспубліцы Карэя ўпершыню нарадзілася дзіцяня гіганцкай панды.**

- Беларусь перадала САІУ дакумент аб далучэнні да Маракешскага дагавора.
- **«БелДжы» ў І паўгоддзі выпусціў больш за 8,6 тысячы аўтамабіляў.**
- Чэмпіянат Беларусі па пажарна-выратавальным спорце пройдзе 24 ліпеня ў сталіцы.

Жніво-2020

І гэта толькі пачатак...

Камбайнеры вытворчага кааператыва імя В. І. Крэмко Гродзенскага раёна плануюць дасягнуць пяцітысячных намалотаў

www.grodnonews.by

Менавіта прадстаўнікі гаспадаркі сталі першымі тысячнікамі рэгіёна і цяпер набліжаюцца да двухтысячнага рубяжа. Як аказалася, тут рэкорды — звыклая справа. Летась прадстаўнік вытворчага кааператыва стаў першым тысячнікам краіны, і вось сёлета Андрэй Расенік зноў у ліку рэкардсменаў. Праўда, не адзін, а са сваім калегам па збожжавым цэху Мікалаем Калбыкам. Цяпер перад камбайнерамі стаіць новая планка — узяць пяцітысячны рубеж. СТАР. 4

ISSN 1990 - 763X

«Чалавек заўсёды важнейшы за грошы»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Любой цаной мы павінны не дапусціць, каб гэтыя складанасці пераносіліся на нашых людзей і каб людзі іх нават адчулі на сабе, — заявіў ён. — Беларусы павінны ведаць, што, напрыклад, барацьба з каранавірусам ужо абышлася бюджэту ў паўмільярда рублёў. Тут і дадатковыя затраты на медыцыну, і сродкі на падтрымку рэальнага сектара эканомікі. Але чалавек заўсёды важнейшы за грошы».

Фота БелТА.

Адпачываць сёлета лепш дома

Дзякуючы нашым агульным намаганням, айчынная сістэма аховы здароўя справілася, заявіў Аляксандр Лукашэнка. Ён паведаміў, што колькасць тых, хто рэальна захварэў на каранавірус, зніжаецца.

Але сітуацыя ў свеце далёка не аптымістычная: гэтай хваробай ужо заразілася амаль 15 мільёнаў чалавек. «Таму, каб пазбегнуць другой хвалі (не дай бог, вядома), ***я падтрымаю медыкаў, якія раяць адпачываць сёлета толькі ў Беларусі». Разам з тым беларускія ўлады нікому нічога не забараняюць,*** звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка. «Куды заўгодна ездзьце, але па вяртанні ў краіну сядзеце на каранцін за ўласны кошт, з усімі выцякаючымі наступствамі, — папярэдзіў ён. — ***Мы стварылі ідэальныя ўмовы для адпачынку ў сваёй краіне.*** Трэба паездзіць па Беларусі, трэба хоць даведацца, што такое Нарач, Браслаўскія азёры, Бярэзінскі запаведнік, Белавежская пушча, пабываць на Дняпры, на Прыпяці, на Нёмане, Сожы, што такое Палессе, паглядзець. Цудоўныя мясціны, і я ўпэўнены, што ў наступным годзе, калі будзе ўсё вельмі добра ў свеце, палова не паедзе за межы краіны, будуць адпачываць тут. Гэта танней абыдзецца. Але я нікога не ўгаворваю».

«Трэба ісці да людзей»

«Сацыяльна арыентаваная палітыка, у цэнтры якой чалавек, яго інтарэсы і патрэбы, была і застанецца цэнтральным звяном пры прыняцці любога рашэння, — акцэнтаваў увагу кіраўнік дзяржавы. — Народ для таго і паставіў нас, каб мы былі гарантам яго бяспекі і спакою». На яго думку, для гэтага трэба больш тлумачыць людзям, што адбываецца ў краіне і свеце, чаму прымаюцца тыя ці іншыя рашэнні.

«Усім трэба ісці да людзей. Трэба размаўляць з людзьмі. Трэба людзям тлумачыць, расказваць пра сваю палітыку», — упэўнены кіраўнік дзяржавы. Падчас бягучай выбарчай кампаніі кіраўніцтва краіны атрымала ад грамадзян вялізны пласт ініцыятыў і пажаданняў. Аляксандр Лукашэнка даручыў выкарыстоўваць гэты канал зваротнай сувязі эканамічным службам усіх узроўняў у іх штодзённай рабоце.

Падчас нарады кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу адказных асоб, у тым ліку работнікаў сваёй Адміністрацыі, свайго прэс-сакратара, спікера Савета Рэспублікі, на неабходнасць удзяляць больш пільную ўвагу рабоце на інфармацыйным полі, прычым не толькі інтэрнэт-, але і традыцыйных СМІ, некаторыя з якіх займаюцца «тэндэнцыйнай падачай інфармацыі». «Няхай паедуць у поле, дзе сёння ідзе сапраўды бітва, барацьба за ўраджай. Небывалы ўраджай на палях сёння стаіць. Зніміце, раскажыце, сфатаграфуйце камбайнера-тысячніка. Раскажыце пра гэтых простых людзей-рабацяг, якія кормяць краіну. Усе ж заўтра пабягуць у крамы, гэтыя пісакі, каб купіць кавалак хлеба сабе, родным, блізкім, дзецям», — адзначыў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў ад адказных асоб выконваць свае абавязкі, а не чакаць спецыяльных указанняў адносна СМІ, якія «заклікаюць да масавых беспарадкаў». На яго думку, у падобных выпадках неабходна прымаць адпаведныя меры, нягледзячы на перадвыбарчы перыяд: «Не трэба чакаць ніякага канца электаральнай кампаніі. Выдварайце адсюль, калі яны не выконваюць нашы законы і клічуць людзей на «майданы».

Для добрых вынікаў ёсць усё

Прэзідэнт прапанаваў удзельнікам нарады спыніцца на трох самых значных пытаннях, якія пастаянна знаходзяцца на кантролі ў грамадства, — зарплат, занятасці і цэн.

«Я ўважліва вывучыў усе статыстычныя і аператыўныя звесткі, меркаванні і настроі людзей. Учора сустракаўся са сваімі даверанымі асобамі. Нейкіх асаблівых незвычайных вынікаў і поспехаў у гэтай рабоце не ўбачыў. Так, той мінімум, што мы абяцалі, дасягнуты. Усе вобласці і горад Мінск у маі ў сярэднім плацілі зарплату па тысячы і больш рублёў (Магілёўская вобласць сем рублёў не дацягнула). Аднак, па маіх звестках, даход значнай часткі насельніцтва пакуль яшчэ ніжэйшы за гэты ўзровень, і не ад усіх людзей мы атрымліваем станоўчую ацэнку сваёй работы», — адзначыў Прэзідэнт.

Ён нагадаў пра пэўную катэгорыю людзей, якія цяжка працуюць і маюць вялізную адказнасць (нянечкі, выхавацелі ў дзіцячых садках), але не атрымліваюць тысячы рублёў. На гэты слой грамадства кіраўнік дзяржавы патрабаваў звярнуць увагу яшчэ ў папярэдняга складу ўрада, знайсці крыніцы павелічэння зарплаты. Вядома, плаціць проста за тое, што чалавек прыйшоў на работу, дзяржава не будзе.

Таму Аляксандр Лукашэнка папрасіў далажыць, якія меры прымаюцца па стварэнні ўмоў для годнага заробку тым, хто імкнецца зарабіць грошы (а такіх большасць, і ім трэба дапамагчы), як вырашаецца застарэлая праблема, калі рост заробкаў апярэджвае рост прадукцыйнасці працы.

«У нас сёння ёсць усё — і ў сельскай гаспадарцы, і ў прамысловасці, — каб мець добрыя вынікі. А калі добрыя вынікі — тады і зарплата. У сельскай гаспадарцы небывалы ўраджай — такога ніколі не было ў гісторыі Беларусі... Сцяной стаіць трыцікале, пшаніца, жыта. Ёсць магчымасць папоўніць тыя рэзервы, якія я за два апошнія гады аддаў у сельскую гаспадарку. У нас не было рэзерваў — сёння бяры не хачу. Калі такі ўраджай, калі падзвіжкі па малаку, мясе і нават па экспарце нашай сельгаспрадукцыі — дык гэта павінны быць грошы ў краіне», — падкрэсліў беларускі лідар.

У сялян ёсць усе магчымасці паправіць эканамічнае становішча ў гаспадарках. Тое самае — і ў прамысловасці, адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Бо Беларусь бадай што адзіная не спыніла вытворчасць. У прыклад Прэзідэнт прывёў кампанію «Атлант», попыт на прадукцыю якой у некалькі разоў павялічыўся ў красавіку—маі, і запатрабаваў таго ж ад астатніх вытворцаў: «Узнік дэфіцыт на многія тавары прамысловасці — ну дык прадайце іх, як робяць гэта іншыя. І папраўце сваю эканоміку».

Даручэнне кіраўнікам рэгіёнаў — як належыць арганізаваць уборку ўраджаю, не чакаючы добрага надвор'я. Якасць уборкі, экспарт сельгаспрадукцыі — на кантролі профільнага міністэрства і віцэ-прэм'ера.

Наконт занятасці Аляксандр Лукашэнка адзначыў: хоць тут таксама ёсць асобныя праблемныя моманты, але «ў цэлым трагізму няма». ***«Нам удалося не дапусціць катастрофы звальвання ў яму беспрацоўя,*** як гэта адбылося нават у нашых суседзяў. Менавіта катастрофы — таму што нават у самых моцных дзяржаў свету не хапіла запасу трываласці, каб захаваць спакой у грамадстве. ***Аднак занятасць у эканоміцы павінна забяспечвацца ўстойлівай і эфектыўнай працай прадпрыемстваў, а не тым, што яны штучна часам стрымліваюць ці ўтрымліваюць людзей. Людзей на прадпрыемствах нельга выкідваць на вуліцу, але яны павінны працаваць. Іх трэба забяспечыць работай»,*** — папярэдзіў кіраўнік дзяржавы. Калі традыцыйных відаў занятасці не хапае, у любым населеным пункце знойдзецца шмат іншай работы, дадаў ён, даручыўшы ў такім выпадку арганізаваць людзей.

Акрамя таго, нагадаў ён, на асаблівым кантролі ўрада і мясцовых органаў улады павінна быць цэнаўтварэнне. Сітуацыя, вядома, не крытычная, але пытанні ў Прэзідэнта застаюцца.

Кіраўнікам абласцей Аляксандр Лукашэнка даручыў праінфармаваць, як на месцах рэалізуюцца нядаўна прынятыя кропкавыя рашэнні аб падтрымцы занятасці і стымуляванні эканамічнай актыўнасці ў цэлым. Паўнамоцтвы, якія атрымалі старшыні абласных, раённых, гарадскіх выканкамаў, кіраўнік дзяржавы назваў «надзвычайнымі», але яны пацягнулі і дадатковую адказнасць. ***«Перад намі стаяць зямныя задачы: чалавек павінен хадзіць на работу, атрымліваць годную зарплату — зароблену, а прадпрыемствы — эфектыўна развівацца»,*** — яшчэ раз абазначыў прыярытэты кіраўнік краіны.

Цікавіла Прэзідэнта, як спрацавалі прадпрыемствы падчас вымушанага прастою, няпоўнай занятасці. Неабгрунтаваныя звальненні хвалююць кіраўніка дзяржавы больш за прагнозы МВФ. Інфармацыю на гэту тэму падрабязна далажыў старшыня Камітэта дзяржкантролю Іван Тэртэль, чыё ведамства ў ручным рэжыме з кіраўніцтвам усіх прадпрыемстваў (у тым ліку прыватных) працуе з кожным зваротам.

Падводзячы вынікі, Прэзідэнт падкрэсліў: задачы на гэты год не здымаюцца, ніякіх патураванняў чакаць не варта нікому. Урад і кіраўнікі абласцей запэўнілі Аляксандра Лукашэнку: ёсць усе падставы для аптымістычнага погляду ў будучыню.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА, Варвара МАРОЗАВА.

• У тэму

Перад новым складам урада Аляксандр Лукашэнка ставіць шэраг задач, галоўная з якіх — не дапусціць падзення эканомікі.

Як далажыў лідару краіны прэм'ер-міністр Раман Галоўчанка, Беларусі прадказвалі глыбокую рэцэсію (ад 4 да 6 працэнтаў падзення ВУП).

«Аднак своечасова прынятыя кіраўніком дзяржавы рашэнні аб незакрыцці прадпрыемстваў, падтрымцы найбольш пацярпелых ад пандэміі арганізацый і калектываў дазволілі не дапусціць падзення і захаваць эканоміку краіны. Урад аператыўна разгарнуў практычную работу разам з рэгіёнамі», — паведаміў Раман Галоўчанка.

Па інфармацыі прэм'ер-міністра, згодна з указамі Прэзідэнта падатковыя льготы і прэферэнцыі атрымалі каля 36 тысяч суб'ектаў гаспадарання і індывідуальных прадпрымальнікаў на агульную суму звыш 31 мільёна рублёў. На месцах прынята больш за шэсць тысяч рашэнняў аб даванні арэндных канікул (аб'ём падтрымкі склаў 25 мільёнаў рублёў).

Раман Галоўчанка паведаміў, што ў адпаведнасці з указамі Прэзідэнта ў Беларусі на падтрымку работнікаў камерцыйных і бюджэтных арганізацый з бюджэту выдзелена 2,6 мільёна рублёў. Большая частка прыйшлася на стымулюючыя выплаты медработнікам і супрацоўнікам сферы сацыяльнага абслугоўвання («кавід-надбаўкі» склалі 213 мільёнаў рублёў).

У рамках рашэння кіраўніка дзяржавы па бягучай падтрымцы прадпрыемстваў пад гарантыі ўрада выкарыстаныя крэдытныя рэсурсы на 145 мільёнаў рублёў (29 працэнтаў выдзеленага Прэзідэнтам ліміту), гарантыі мясцовых органаў улады — 109 мільёнаў (15,6 працэнта), адзначыў кіраўнік урада.

«ВУП за паўгода склаўся на ўзроўні 98,3 працэнта, за чэрвень прырост склаў 0,1 працэнта, — расказаў журналістам прэм'ер-міністр. — Пастараемся выйсці на тыя задачы, якія паставіў кіраўнік дзяржавы: мінімум — гэта захаваць леташні ўзровень. Гэта само па сабе складана (многія нашы суседзі загадзя прызналіся, што гэта немагчыма, і для сябе запланавалі лічбы падзення да мінус 10 працэнтаў). Але мы плануем прырасці».

На пытанне журналістаў пра тое, на што абапіраецца ўрад пры выхадзе з крызісу, акрамя экспарту, Раман Галоўчанка адказаў:

«Экспарт — безумоўны прыярытэт. Сёлета вельмі добрае надвор'е, якое дазволіла вырасціць добры ўраджай. Задача цяпер — яго не страціць. Попыт на харчаванне вялікі. Мы за кароткі перыяд змаглі істотна нарасціць экспарт харчавання і ў Кітай, і ў Расійскую Федэрацыю, і ў Польшчу, і ва Украіну».

Энергетыка

АЭС стымулюе электраспажыванне

і будаўніцтва электрычных дамоў, катлоў і транспарту

Да 2025 года ў Беларусі плануецца ўвесці да 1200 МВт новых электрычных магутнасцяў, што супастаўна з магчымасцямі аднаго энергаблока, а каб выраўняць графікі нагрузкі спажывання электраэнергіі, у межах інтэграцыі АЭС у энергасістэму ўжо сёлета пачнуць працаваць электракатлы агульнай магутнасцю 916 МВт. Пры гэтым спажыванне дамамі электраэнергіі на ацяпленне і гарачае водазабеспячэнне да 2025-га можа дасягнуць 370 млн кВт·г у год, калі захаваюцца штогадовыя тэмпы будаўніцтва па 3500 кв. м. Пра «электрычныя» перспектывы для Беларусі ад уводу ў эксплуатацыю атамнай станцыі расказалі спецыялісты.

Электразаправак будзе больш, чым АЭС

Увод у эксплуатацыю Беларускай АЭС прынясе ў краіну новыя тэхналогіі, матэрыялы, абсталяванне. Гэта крок наперад, які дазволіць краіне знізіць энергаёмістасць валавога ўнутранага прадукту, павялічыць сам ВУП і ўкараніць новыя тэхналогіі, лічаць эксперты эканамічнай галіны.

У межах уводу прадугледжана 178 мерапрыемстваў, сярод якіх мадэрнізацыя існуючых вытворчасцяў і ўвод новых — ад прамысловых да нафтахімічных прадпрыемстваў. У прыватнасці, запланаваныя мадэрнізацыя і рэканструкцыя «Гроднаазота», Мазырскага НПЗ, Беларускага металургічнага завода, расказаў **Міхаіл МАЛАШАНКА, намеснік старшыні Дзяржкамітэта па стандартызацыі, дырэктар Дэпартамента па энергаэфектыўнасці:**

— Прадугледжваюцца і дадатковыя мерапрыемствы па-за межамі плана. Гэта замена выкарыстання прыроднага газу на электрычныя тэхналогіі: ТВЧ-печы ў кавальных цэхах, цэхах апрацоўкі металу, укараненне індукцыйных печаў, інфрачырвоных сістэм абагрэву, замена паравых тэхналогій электраэнергіяй. Новыя кірункі можна ўжыць на 20 прадпрыемствах.

У сістэме ЖКГ гатовыя замясціць неэнергаэфектыўныя крыніцы, для якіх сабекошт гігакалорыі складае больш за 100 рублёў. Укараніць электранагрэў і тэхналогіі кампрэсійных цеплавых помпаў, якія дазволяць зменшыць кошт гігакалорыі да 40-50 рублёў, мяркуецца ў тым ліку і на асобных энергакрыніцах, якія яшчэ працуюць на дровах, вугалі, мазуце.

— З улікам існавання льготнага тарыфу для энергакрыніц сістэм ЖКГ прадугледжваем і ўвод прамога электранагрэву, — дадаў суразмоўца. — Усё гэта дазволіць павялічыць электраспажыванне ў краіне да 2 млрд 800 млн кВт·г. Аднак гэта не самамэта — перш за ўсё гэта новыя тэхналогіі, якія зрабілі рэальнасцю электратранспарт у краіне. У Беларусі пакуль каля 240 зарадных станцый, а сёлета іх стане больш чым усіх існуючых у дзяржаве АЗС.

Больш электраспажывання — вышэйшы ВУП

Чым большае электраспажыванне на душу насельніцтва, тым вышэйшы ўзровень эканамічнага і сацыяльнага развіцця краіны, і патэнцыял для павелічэння спажывання электраэнергіі ў краіне ёсць, падкрэсліў **Аляксандр МІХАЛЕВІЧ, навуковы кіраўнік Інстытута энергетыкі НАН Беларусі:**

— Калі электраспажыванне на ўзроўні 2-3 тысяч кВт·г у год на чалавека, то гэта не дае ніякага росту ВУП. А вось калі гэтая лічба ад 3 тысяч да 8-10 тысяч, пачынаецца павелічэнне валавога ўнутранага прадукту. У мінулым стагоддзі ў межах БССР чалавек выкарыстоўваў каля 5000 кВт·г у год, у сучаснай Беларусі — 3800. Так што развіццё электратэхналогій — неабходнасць часу.

Яшчэ адзін патэнцыйны кірунак для павелічэння электраспажывання — будаўніцтва цалкам электрыфікаванага жылля ў аддаленні ад цеплатрас і газаправодаў. У гэтым выпадку электражыллё на 15 % таннейшае, бо не трэба пракладваць да будынкаў дарагія інжынерныя камунікацыі, падкрэсліў вучоны.

Раздавай ды правярай

Акрамя павелічэння выкарыстання электрычнасці, трэба сачыць і за якасцю яе падачы. Пра рэгуляванне сутачнага графіка спажывання электраэнергіі расказаў **Уладзімір БАБРОЎ, першы намеснік гендырэктара, галоўны інжынер Белэнерга.**

У начны час у сістэме, як правіла, глыбокія правалы па спажыванні, а зранку пачынаецца пік. Такі перапад быў заўжды, незалежна ад наяўнасці АЭС у краіне. Тым не менш у межах інтэграцыі станцыі ў энергасістэму краіны спецыялісты прапанавалі шэраг мер для павышэння надзейнай работы ў базавым рэжыме. У прыватнасці, прадугледжаны ўвод катлоў магутнасцю 760 МВт на электрастанцыях, у тым ліку Бярозаўскай, Лукомскай ГРЭС, а ў астатнім — на ЦЭЦ і міні-ЦЭЦ. Акрамя таго, 156 МВт — на кацельных з вялікай магутнасцю энергаспажывання ў абласцях краіны. Пры гэтым агульная іх магутнасць 916 МВт датычыцца толькі катлоў на аб'ектах Мінэнерга, дзе ўжо ўведзена 170 МВт на цеплаэлектрацэнтралях і 26 МВт — на кацельных. Аднак у планах — арганізацыя магутнасцяў у 1116 МВт.

— Гэта забяспечыць мяккасць праходжання начных правалаў спажывання электрычнай нагрузкі. У гэты час мы разгружаем наша абсталяванне — цеплавыя і электрычныя цэнтралі — да мінімуму. А цяпло, якое патрэбна адпусціць спажыўцу, дагараем на электракатлах, — расказаў Уладзімір Баброў. — З'яўленне электракатлоў на буйных ЦЭЦ, якія, як правіла, знаходзяцца ў межах горада, выпраўляе і экалагічную абстаноўку. Мы менш палім, а таксама дадаткова рэзервуем паліва па відах паліўна-энергетычных рэсурсаў (ПЭР). У любым выпадку ўсе ЦЭЦ могуць працаваць і на газе, і на вадкім паліве (мазут, дызель), а цяпер змогуць яшчэ і на электрычнасці.

Такім чынам, да адкрыцця першага блока АЭС энергетыкі рэалізавалі праграму з электракатламі, павысілі электраспажыванне і стварылі надзейнае рэзерваванне па электрычнай і цеплавой схеме. А вось з арыентацыяй на далейшую работу двух энергаблокаў АЭС запланавана будаўніцтва пікава-рэзервовых крыніц, якія будуць уведзены налета.

Ірына СІДАРОК.
Фота аўтара.

Блізкая ўлада

ПАДЗЯЛІЦЕСЯ ТЫМ, ШТО ХВАЛЮЕ

Традыцыйна па суботах аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам праводзяцца прамыя лініі ў мэтах павышэння эфектыўнасці работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб, выкаранення фактаў бюракратызму і цяганіны, паператворчасці, а таксама для аператыўнага вырашэння праблемных пытанняў, якія ўзнікаюць у людзей.

Тэлефонныя лініі ў суботу, 25 ліпеня, з 9:00 да 12:00 правядуць:

- старшыня Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў Юрый Іосіфавіч НАРКЕВІЧ. Тэл. 8 016 221 31 21;
- старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай Мікалаевіч ШАРСНЁЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;
- намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Уладзімір Уладзіміравіч ГАРБАЧОЎ. Тэл. 8 023 233 12 37;
- намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віталь Іосіфавіч НЯВЕРА. Тэл. 8 015 273 56 44;
- намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Руслан Барысавіч СТРАХАР. Тэл. 8 022 250 18 69;
- кіраўнік спраў Мінскага аблвыканкама Уладзімір Аляксандравіч ГУРЫНОВІЧ. Тэл. 8 017 500 41 60;
- першы намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Дзмітрый Міхайлавіч МІКУЛЁНАК. Тэл. 8 017 222 44 44.

Навука для спорту высокіх дасягненняў

Каля 1 мільёна рублёў плануе накіраваць Дзяржаўны камітэт па навуцы і тэхналогіях Беларусі на фінансаванне навукова-даследчых праектаў ДУ «Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр спорту».

Пра гэта паведаміў падчас наведвання РНПЦ спорту **старшыня ДКНТ Аляксандр ШУМІЛІН.** На наступныя пяць гадоў запланавана рэалізацыя праектаў па ацэнцы біямеханікі і рэакцыі сардэчна-сасудзістай сістэмы на фізічную нагрузку з выкарыстаннем касцюма з 3D-мадэляваннем, па распрацоўцы сучасных аднаўленчых методык пасля рэканструктыўных аперацый каленных суставаў і вывучэнні рызыкі развіцця паталогіі апорна-рухальнага апарату ў залежнасці ад віду спорту. «РНПЦ спорту актыўна ўзаемадзейнічае ў навуковым і практычным кірунку з Міністэрствам аховы здароўя, НАН Беларусі і Дзяржкамітэтам па навуцы і тэхналогіях. Такое цеснае супрацоўніцтва дазволіла вывесці работу цэнтра на прынцыпова новы ўзровень — лабараторыя спартыўнага траўматызму валодае ўнікальнымі айчыннымі тэхналогіямі і аснашчана сучасным высокатэхналагічным абсталяваннем», — адзначыў Аляксандр Шумілін.

У сваю чаргу, **дырэктар ДУ «Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр спорту» Ірына МАЛЯВАНАЯ** паведаміла, што ў лабараторыі праводзіцца дыягностыка стану апорна-рухальнага апарату ад шыйнага аддзела пазваночніка да ступняў і лячэння траўмаў і захворванняў апорна-рухальнага апарату спартсменаў высокага ўзроўню метадамі рэгенератыўнай медыцыны. «З дапамогай оптыка-тапаграфічнай сістэмы мы маем магчымасць дыягнаставаць парушэнні апорна-рухальнага апарату, а таксама вызначаць наяўнасць мышачнага дысбалансу ў спартсменаў. Галоўнай перавагай оптыка-тапаграфічнага метаду з'яўляецца адсутнасць прамянёвай нагрузкі, што робіць гэты метад незаменным для дынамічнага назірання за спартсменамі», — падкрэсліла яна.

У лабараторыі спартыўнага траўматызму абследаваліся ўжо больш за 1,5 тысячы спартсменаў, якім па выніках тэсціравання былі дадзены індывідуальныя рэкамендацыі па рэабілітацыі і трэніровачным працэсе. Цяпер у РНПЦ спорту прыступілі да работы па аказанні высокатэхналагічных паслуг на экспарт. За кошт гэтага будуць акуплены дзяржаўныя ўкладанні і павялічаны паступленні валюты ў краіну.

Для правядзення навуковых даследаванняў з выкарыстаннем найноўшага сучаснага абсталявання, у тым ліку ў РНПЦ спорту, у краіне з лютага 2020 года функцыянуе навукова-адукацыйны кластар «Інавацыйныя тэхналогіі ў спорце».

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Прэзідэнт ЗША лічыць, што эпідэміялагічная сітуацыя ў краіне можа пагоршыцца

Пра гэта Дональд Трамп заявіў, выступаючы перад журналістамі, паведаміла РІА «Навіны». «На жаль, спачатку стане горш перад тым, як будзе лепш. Мне не падабаецца казаць гэта, але справы такія», — адзначыў амерыканскі лідар. Ён дадаў, што смяротнасць ад каранавірусных прычын у Амерыцы працягвае зніжацца. Тым не менш ЗША застаюцца сусветным лідарам па адпаведным паказчыку — з моманту пачатку эпідэміі ў Штатах памерла больш за 140 тысяч пацыентаў з пацверджаным COVID-19. Акрамя таго, зафіксавана звыш 3,8 мільёна выпадкаў заражэння. Пры гэтым Трамп назваў «панікёрам» дырэктара Нацыянальнага інстытута алергічных і інфекцыйных захворванняў краіны Энтані Фаўчы. Днямі прэзідэнт ЗША заявіў, што не будзе патрабаваць ад кожнага амерыканца насіць ахоўныя маскі. «Я хачу, каб у людзей была пэўная свабода», — сказаў Трамп.

Кітай запусціў сваю першую міжпланетную станцыю да Марса

Цяжкая ракета-носьбіт «Чанчжэн-5» (CZ-5) стартавала з першай кітайскай місіяй па даследаванні Марса «Цяньвэнь-1» («Пытанні да неба»), паведаміў тэлеканал CCTV. Запуск быў ажыццёўлены са стартавай пляцоўкі LC101 кітайскага касмадрома Вэньчан, размешчанага на востраве Хайнань. Агульная маса ракеты з аўтаматычнай міжпланетнай станцыяй «Цяньвэнь-1», якая складаецца з арбітальнага апарата і пасадачнай платформы з марсаходам, — каля пяці тон. Мэта кітайскай місіі — знайсці сляды жыцця на Марсе, а таксама вывучыць магчымасці для яго патэнцыйнай каланізацыі чалавекам. Станцыя павінна дасягнуць Чырвонай планеты 11 лютага 2021 года. У гэты час яна пачне выконваць тармазны манеўр і выйдзе на арбіту Марса. Плануецца, што 11 красавіка 2021-га пасадачная платформа з лёгкім 240-кілаграмовым марсаходам аддзеліцца ад арбітальнага апарата і здзейсніць пасадку на паверхню планеты. Папярэднім месцам пасадкі абраны раён паўднёвай часткі раўніны Утопія ва ўсходняй частцы паўночнага паўшар'я Марса.

Золата і серабро рэкордна падаражэлі

Золата падаражэла да максімуму са жніўня 2011 года на фоне росту напружанасці ў адносінах паміж Вашынгтонам і Пекінам. Кошт ф'ючарсаў на золата з пастаўкай у жніўні вырас на Comex на 1,2 працэнта — да 1865,1 долара за унцыю. Гістарычны рэкорд па цане закрыцця быў зафіксаваны 22 жніўня 2011 года — $1891,9, сведчаць даныя Dow Jones Market Data. Найвышэйшы ўнутрыдзённы паказчык быў дасягнуты 6 верасня 2011-га — $1923,7 за унцыю. Серабро па выніках таргоў падаражэла да сямігадовага максімуму, паведаміў MarketWatch. Каціроўкі вераснёўскіх ф'ючарсаў на гэты каштоўны метал на Нью-Ёркскай таварнай біржы (NYMEX) падскочылі на 7,4 працэнта — да максімальных з верасня 2013-га 23,144 долара за унцыю.

На кантролі

НОВЫ ЎЗРОВЕНЬ

У Маларыцкай раённай бальніцы будзе праведзена рэканструкцыя хірургічнага корпуса, які змяшчае прыёмнае, гінекалагічнае, неўралагічнае, рэанімацыйнае аддзяленні.

Уся сістэма аховы здароўя Маларыцкага раёна за апошняе дзесяцігоддзе перажыла паэтапнае грунтоўнае абнаўленне. Зроблены рамонт і ўстаноўлена новае абсталяванне ў амбулаторыях, ФАПах, карпусах цэнтральнай раённай бальніцы. І вось — добрая навіна пра будучую рэканструкцыю хірургічнага корпуса. Работа прадугледжана распараджэннем кіраўніка дзяржавы «Аб дадатковых мерах па вырашэнні актуальных пытанняў жыццядзейнасці насельніцтва». Навіну абмяркоўваюць не толькі ў горадзе, але і ў раёне.

Старшыня Лукаўскага сельскага Савета Алена МАРУК кажа, што раённая бальніца — аб'ект першарадны для кожнага жыхара раёна, і працягвае:

— Для нас, сельскіх жыхароў, вельмі важна, што перад раённымі дажынкамі 2018 года Лукаўская амбулаторыя літаральна перамянілася. Маю на ўвазе не толькі і не столькі рамонт, паляпшэнне знешняга выгляду і ўмоў працы, колькі найперш сучаснае абсталяванне цэлага шэрагу кабінетаў. Урач агульнай практыкі Вікторыя Яраш і яе памочнікі аказваюць дапамогу насельніцтву на сучасным узроўні. Па графіку прыязджае стаматолаг.

— Летась грунтоўна абнавілі Дарапеевіцкі ФАП, — расказвае **галоўны ўрач Маларыцкай цэнтральнай раённай бальніцы Пётр СЕЛІВОНІК.** — Варта сказаць, што ў нас усе сельскія медыцынскія ўстановы ўладкаваныя за апошняе дзесяцігоддзе. Новае аблічча набылі Ляхавецкая амбулаторыя, Чарнянскі і Гвозніцкі ФАПы.

Ну і вялікая работа праведзена па абнаўленні нашай цэнтральнай бальніцы. Рэканструкцыя пачыналася таксама напярэдадні дажынак 2010 года і паспяхова працягвалася ў наступных пяцігодках. Найперш быў праведзены рамонт у дзіцячым, тэрапеўтычным, інфекцыйным аддзяленнях. Тады адрамантавалі памяшканні, з'явіліся новыя санвузлы, набылі новую мэблю і абсталяванне. Сучасны выгляд атрымала паліклініка.

Вялікая работа зроблена ў 2013—2014 гадах. Абноўлены дзённы стацыянар. Пазней прыступілі да запланаванай работы па рэканструкцыі харчовага блока. Акрамя рэканструкцыі і рамонту памяшкання аднаго з найважнейшых падраздзяленняў бальніцы, яго аснасцілі сучасным абсталяваннем для гатавання ежы і захоўвання прадуктаў. Гэта важны аспект дзейнасці бальніцы, бо любы ўрач скажа вам, што якаснае харчаванне — неабходны складнік усяго комплексу лячэння хворага.

— Шмат чаго новага з'явілася ў бальніцы апошнім часам, — працягвае аповед галоўны ўрач. — Новы рэнтген-апарат на два рабочыя месцы мы атрымалі пазалетась. Цяпер у нас

задзейнічаны тры апараты разам з флюарографам. Таму зрабіць любы здымак як у плане прафілактыкі, так і ў плане дыягностыкі цяпер не праблема, чэргаў у гэтыя кабінеты не збіраецца.

Асобная размова пра транспарт. Для маларыцкай бальніцы, якая ў многім арыентавана на ўстановы абласнога цэнтра, гэта, без перабольшвання, пытанне жыцця. Скажам, у горадзе няма радзільнага аддзялення, парадзіх адсюль вязуць у Кобрын альбо Брэст. Таму пра важнасць абнаўлення аўтапарка нават гаварыць не трэба. Летась станцыя хуткай дапамогі атрымала два новыя аўтамабілі. Дарэчы, у мінулым годзе таксама з'явілася новая машына для транспарціроўкі пацыентаў у Брэсцкую абласную бальніцу на працэдуру гемадыялізу — думаю, усе ведаюць пра такую паталогію, якая вымушае тры разы на тыдзень праходзіць названую працэдуру, каб захаваць жыццё.

Дарэчы, усе амбулаторыі і фельчарска-акушэрскія пункты раёна забяспечаны транспартам для мабільнасці медперсаналу.

Ну і лагічным працягам абазначанай вялікай работы Пётр Селівонік назваў капітальны рамонт хірургічнага корпуса, запланаваны на 2021—2022 гады. Пётр Міхайлавіч растлумачыў, што корпус называецца хірургічным, хоць умяшчае ў сябе нашмат больш падраздзяленняў лячэбнай установы. Гэта двухпавярховы будынак 1963 года пабудовы. Там размешчаныя прыёмнае аддзяленне, рэанімацыя, а таксама хірургічнае аддзяленне з аперацыйным блокам, гінекалагічнае і неўралагічнае аддзяленні.

Праектна-каштарысная дакументацыя ўжо ёсць. З пачаткам фінансавання стартуе цеплавая рэабілітацыя, будуць заменены інжынерныя камунікацыі, пракладзеныя новыя трубы, затым пачнуцца рамонт, мадэрнізацыя палат, санвузлоў, памяшканняў для персаналу. Ну і фінальным акордам стануць замена абсталявання, купля новай мэблі. Па сутнасці, абновіцца паўбальніцы. Вядома, палепшаюць умовы знаходжання пацыентаў, дый якасць аказання медыцынскай дапамогі ўздымецца на прыступку вышэй, — адзначае галоўны ўрач.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

І гэта толькі пачатак...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Вядома, гонка тут ні пры чым. Камбайнеры не ставяць мэту любой цаной выбіцца ў лідары. Ды гэта і немагчыма: няякасная ўборка адразу будзе выяўлена і галоўным аграномам, і старшынёй калгаса. Але вопытным работнікам жніва не патрэбен татальны кантроль — яны самі сабе кантралёры.

— У гаспадарцы для нас створаны ўсе ўмовы — толькі працуй, — заўважае Андрэй Расенік. — Можна сказаць, робіцца ўсё, каб нам было камфортна, — і тэхніка самая сучасная, і добрыя абеды ў тэрмін.

Ды і самі камбайнеры разумеюць, як важна своечасова сабраць ураджай. За плячыма — не год, а 15-20 сезонаў напружанай працы. За гэты час, безумоўна, вопыту значна прыбавілася. Але не толькі ў гэтым справа. У вытворчым кааператыве імя В. І. Крэмко традыцыйна высокія ўраджаі, якія абумоўлены самымі сучаснымі тэхналогіямі, эфектыўнай тэхнікай і прадукцыйным насеннем.

У адрозненне ад мінулага года, сёлетняя ўборка пачалася ў аптымальны тэрмін. Паспрыяла гэтаму і надвор'е. У любым выпадку не адчувалася такога дэфіцыту вільгаці, таму збожжа атрымалася паўнавартаснае. **Старшыня гаспадаркі Сяргей КРЭМКО** відамі на ўраджай задаволены. І хоць напярадзе яшчэ даволі значны аб'ём работ, ход жніва ўсяляе аптымізм. Гаспадарка выйшла ў лідары па ўраджайнасці азімага ячменю — гэтай фуражнай культуры тут сабрана 99 цэнтнераў з гектара. Не меншай аддачы тут чакаюць і ад іншых злакаў.

Разам з тым хлебаробы пагаджаюцца: жніво-2020 — не з самых лёгкіх. Пры добрай спеласці збожжа хуткім тэмпам перашкаджае значная палеглась палеткаў. Ураганы, якія раз-пораз накрывалі рэгіён, значна пашкодзілі пасевы. Ды і цяпер, падчас уборкі, трэба карыстацца кожнай сонечнай хвілінай. Такую тактыку абраў для сябе і Мікалай Калбыка. Вопытны камбайнер гатовы працаваць увесь светлавы дзень. І не толькі дзеля таго, каб паставіць чарговы рэкорд. Яго галоўная задача — атрымаць максімальны эфект ад поля. Як кажуць хлебаробы, сабраць ураджай якасна і без страт.

І хоць праблемныя фактары ёсць, камбайнеры-калегі даволі хутка дасягнулі тысячнага намалоту. Кажуць, што маглі б яшчэ хутчэй, каб спрыяла надвор'е. Але ж дасягнуць такога выніку ўсяго за 10 дзён удаецца далёка не кожнаму. Паколькі плошчы пад збожжавыя ў гаспадарцы значныя — больш за тры тысячы гектараў, — абодва хлебаробы мяркуюць адправіць у бункер не адну тысячу тон. Удалы рывок, дарэчы, не застаўся па-за ўвагай мясцовых улад і прафсаюзаў: хлебаробам-лідарам уручаны дыпломы, грашовыя прэміі і падарункі. А старшыня калгаса наогул паставіў сваім перадавікам задачу дасягнуць пяцітысячнага намалоту. І хоць доля рызыкі тут ёсць, камбайнеры будуць ісці да гэтай мэты. Напрыклад, летась Андрэю Расеніку не хапіла менш чым паўтары тысячы тон, каб дасягнуць гэтай лічбы. Ва ўсякім выпадку, ураджай павінен быць высокі. Па словах **намесніка старшыні Станіслава ВІНЦКЕВІЧА,** цяпер тут атрымліваюць 93 цэнтнеры з гектара, прытым што скошана толькі чацвёртая частка палеткаў. Штодзень на палі выходзіць караван з 15 камбайнаў — аптымальная колькасць для паўнавартаснай уборкі.

Як паведамілі ў аблсельгасхарчы, у рэгіёне на 23 ліпеня сабрана 127 тысяч тон збожжа. Ураджайнасць складае 52,7 цэнтнера з гектара. Самая высокая — у Гродзенскім раёне — 82 цэнтнеры. У асноўным сілы гаспадарак засяроджаны на ўборцы азімага рапсу. А вось азімы ячмень убраны цалкам.

Сёлета вобласць плануе атрымаць не менш за 1,5 мільёна тон збожжавых і зернебабовых, што на 150 тысяч тон больш, чым летась. Для гэтага трэба сабраць ураджай з 356 тысяч гектараў. Зараз убрана крыху больш за 8 % плошчы. Работы плануецца правесці ў сціслыя тэрміны — сёлета ў вобласці з'явілася каля паўсотні новых камбайнаў беларускай і замежнай вытворчасці.

• У тэму

Разам з уборачнай кампаніяй разгарнулася падрыхтоўка да абласных Дажынак. Сёлета свята хлебаробаў прыме горад-спадарожнік Скідзель. Тут цяпер вядуцца даволі маштабныя работы па добраўпарадкаванні.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

Надвор'е

Вецер з захаду прагоніць халодныя ночы

На выхадныя тэмпературны фон будзе на 2—3 градусы перавышаць кліматычную норму

Ужо з гэтай суботы ў нас значна пацяплее, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

У ноч на чацвер было зафіксавана самае халоднае надвор'е ў сёлетнім ліпені. У ранішнія гадзіны тэрмометры на большай частцы тэрыторыі краіны паказвалі 6—9 градусаў вышэй за нуль.

У суботу надвор'е ў нас будзе знаходзіцца пад уплывам атмасфернага фронту і цёплых няўстойлівых паветраных мас, якія распаўсюджваюцца з Заходняй Еўропы. Будзе воблачна з праясненнямі. Уначы месцамі, раніцай і ўдзень на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах навальніцы. Вецер прагназуецца паўднёвы ўмераны, пры навальніцах парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 8 градусаў да плюс 15, удзень будзе ад плюс 20 па поўначы да 29 цяпла па поўдні краіны. Тэмпературны фон вернецца да кліматычнай нормы, а месцамі будзе на 2—3 градусы перавышаць яе.

Зона ўпэўненага цяпла распаўсюдзіцца і ў наступныя дні. У нядзелю надвор'е ў асноўным вызначыць вобласць паніжанага атмасфернага ціску, якая была сфарміравана ў цёплым паветры. Паменшыцца воблачнасць. Месцамі па краіне, а па Гомельскай і Магілёўскай абласцях на большай частцы тэрыторыі пройдуць кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах з навальніцамі. Вецер прагназуецца ўсходні ўмераны, пры навальніцах парывісты. Уначы і раніцай месцамі магчымы слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе ўжо 10—17 цяпла. Удзень будзе ад плюс 20 градусаў да плюс 27, па поўдні — да 29 цяпла.

У панядзелак захаваецца ўплыў цёплых паветраных мас. Чакаецца пераменная воблачнасць. Уначы ў асобных раёнах, удзень месцамі, пераважна па паўночным захадзе Беларусі, пройдуць кароткія летнія дажджы з навальніцамі. Тэмпература паветра ўначы складзе 12—18 градусаў цяпла. Удзень будзе таксама цалкам па-ліпеньску — ад плюс 25 да 31 цяпла. Толькі па паўночным захадзе краіны, дзе чакаюцца шчыльныя аблокі, будзе адносна халадней — плюс 19—24 градусаў. Сіноптыкі адзначаюць, што цёплае надвор'е захаваецца аж да пачатку жніўня.

Сяргей КУРКАЧ.

Духоўнае

Пад абаронай Маці Божай Баркалабаўскай

На Магілёўшчыне адбыўся хрэсны ход у гонар цудатворнай іконы

Гэты абраз — адзін з самых шанаваных у Беларусі, дзень яго памяці адзначаецца 24 ліпеня.

Сёння ён захоўваецца ў Свята-Узнясенскім манастыры аграгарадка Баркалабава Быхаўскага раёна. Як сведчыць падanne, яго тут пакінуў рускі князь Пажарскі, калі вяртаўся з баявога паходу дадому. Коні князя спыніліся каля святога месца і не рухаліся далей. Каб працягнуць шлях, ён быў вымушаны развітацца з абразам. Ікона асабліва праславілася цудамі падчас Паўночнай вайны і вайны з Напалеонам 1812 года.

Цудатворны абраз датуецца XVI стагоддзем. Доўгі час, пасля таго як у 1920 годзе манастыр быў закрыты, ікона знаходзілася ў адным з храмаў Быхава. У ліпені 2010 года яна вярнулася ў адноўлены манастыр у Баркалабава.

З таго часу праваслаўныя вернікі адзначаюць дзень знаходжання гэтай іконы і вяртання яе ў манастыр. Па дабраславенні архіепіскапа Магілёўскага і Мсціслаўскага Сафронія напярэдадні свята з Магілёўскага Свята-Мікольскага манастыра адправіўся хрэсны ход у Баркалабава. 40-кіламетровы маршрут пралягае праз аграгарадкі Буйнічы, Салтанаўка, Дашкаўка. Вернікі ўвесь шлях аддаюць даніну пашаны цудатворнаму вобразу — пяюць рэлігійныя песні і славяць Божую Маці.

Пандэмія ўнесла невялікія карэктывы ў падзею. Усіх удзельнікаў папрасілі мець пры сабе аднаразовы посуд і выконваць супрацьэпідэмічныя меры перасцярогі.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

Фота перададзена паломнікамі хрэснага хода.

...ШТО ТАКСАМА СРОДАК!

Так павялося, што ў прысутнасці майго мужа ніхто не расказвае анекдотаў пра цешчу, а пры мне — пра свякроў. Тэма — пад забаронай, бо матулі ў нас проста залатыя былі: і з дзецьмі нам заўжды памагалі, і з грашыма... А таму, калі пастарэлі, ужо мы, усёй сям'ёй, часцяком праведвалі, клапаціліся пра маю матулю (яна, дзякуй богу, блізка жыла) і на зіму забіралі з хутара свякроў.

Помню, як перавезлі яе ўпершыню, як спачатку яна хадзіла тут з кута ў кут і не знаходзіла сабе ніякіх заняткаў, як да ўсяго прыглядалася. Я, напрыклад, іду на кухню есці гатаваць, і яна за мной. Сядзе на табурэтку і глядзіць... Альбо нехта ў краму ідзе. І яна тады падхопіцца: «А ў якую? А што трэба купіць? А вазьміце мяне...»

Я думала, што гэта проста так, з жаночай цікавасці, а яна неяк кажа: «Ідзі, адпачні. Я ж таксама не зломак. Што я, вам бліноў не спяку?»

Вось так, паступова, яна стала браць на сябе частку хатняй работы: пакуль магла, любіла хадзіць у краму і ездзіць на рынак (ёй гэта вельмі цікава было, бо сама гадоў з дзесяці працавала ў гандлі), нешта гатаваць, выпраўляць у школу дзяцей (сачыць, каб пад'елі, добра адзеліся, каб нічога не забылі)...

І адзінае, што ёй тады перашкаджала, — гэта галаўны боль: разбаліцца, бывае, галава, а з хворай...

У той дзень ёй на рынак трэба было. Дарога туды вядомая і пад настрой: альбо два прыпынкі пехатой, альбо на аўтобусе.

Бабуля (як потым расказвала) паехала. Спачатку пахадзіла там, паглядзела на цэны — разнервавалася. Галава яшчэ болей стала балець. Тады яна хуценька ўзяла самае неабходнае і падалася назад на прыпынак. На лаўку паставіла свае цяжкаватыя пакеты, кінула вокам на тавары ў кіёску... Прачытала: «Сродак ад галаўнога болю». Здзівілася, што ў яго ніякай назвы няма. Але ж раптам добры? І чаргі ніякай. Дык чаму б не ўзяць?

— Прыгледзьце тут за маімі клункамі, — папрасіла нейкага дзядка. — Я ад галавы той сродак вазьму.

— Сабе? — здзівіўся чамусьці мужчына.

— А каму ж? — кінула ў адказ. — У маладых цяпер галовы не баляць.

Карацей, шчаслівая была, што купіла: і ў аптэку ісці не трэба было, і аўтобус якраз...

Яна хутка прыехала дамоў, распакавала сумкі, вырашыла крыху адпачыць. А перад тым — дастала той куплены сродак ад галаўнога болю, разгарнула яго і... села. Твар тут жа заліўся чырванню, успомніўся здзіўлены позірк дзядка... У абгортцы быў... прэзерватыў, што, вядома ж, сродак... І ад галаўнога болю таксама!

Бабуля (як потым прызналася) доўга смяялася сама, а вечарам ужо і са мной.

Што цікава, галава ёй потым меней балела, бо калі пачынала, у памяці адразу ўсплывала тая прыгода. А немцы ж, мусіць, недарэмна гавораць, што смех — гэта здароўе?

А. Мурашка, *г. Мінск.*

КРУЦІ НЕ КРУЦІ, А ТРЭБА ЎМЯРЦІ...

Не мной заўважана, што апошнім часам вельмі шмат хто любіць страшылкі — навіны аб розных катастрофах, пажарах, землятрусах. І чым цяжэйшыя там наступствы, тым цікавей, як быццам, тым болей пра іх размоў. Людзей нібы нават «грэе», што гэта ж недзе там, што далёка, што нас не закране.

А тут раптам вірус (і скуль ён толькі ўзяўся?), прычым не дзесьці, а паўсюль і побач. Можа, у некага на руках, а чалавек глядзіць і нічога не бачыць. Ён толькі слухае ды тое, што пачуў, далей перадае. Не без таго — крыху дадумаўшы, каб страшней атрымалася... Перафразуючы Ранеўскую, паніка — страшная сіла.

У нас вось адна бабулька захварэла. «Хуткая» да яе на выклік прыехала — забрала ў бальнічку. Вуліца ўсё гэта ўбачыла і хуценька свой прысуд: усё, маўляў, капец бабцы Мар'і — вірус.

Над сям'ёй ды суседзямі («кантактамі ўсіх узроўняў») тут жа павісла трывога. Людзі пазапіраліся ў хатах. І таму неяк не заўважылі, што тую бабцю абследавалі, нічога такога не знайшлі і таму больш-менш здаровую прывезлі дамоў...

А не заўважылі — дык значыць і не сціхлі: чуткі распаўзаліся далей і далей, і пакуль яны да ваколіц дайшлі, тая Мар'я з нейчай падачы ўжо і таго — памерла.

...Таварышку яе, бабку Ганну гэта вельмі засмуціла — нават да слёз. Але ж плач, не плач — гору не паможаш. «З жывой, — падумала, — мы даўно не сядзелі, дык трэба хоць ля труны... Ну і адвітацца, у апошнюю дарогу чалавека правесці».

Карацей, сабралася яна, у хустачку загарнула дзясятку, каб Мар'інай сям'і пакінуць. Потым падумала і яшчэ адну дадала...

А ўрэшце захацела пазваніць у хату да нябожчыцы, спытаць, калі ж адпяванне.

Набрала нумар. Ёй хтосьці адказаў... І нібыта знаёмы?

— Хто гэта? — папыталася Ганна.

Голас той называе прозвішча Мар'і...

— ?!

А следам — яе... імя.

— Дык яна ж памерла?! — устрапянулася Ганна.

— Ага, памерла, — згаджаецца «нябожчыца», — і цяпер з тога свету з табой гаворыць... Кажы, што хацела?

— Дык да цябе на адпяванне прыйсці... Ужо і сабралася...

Іншая жанчына тут бы ў крыўду, відаць, а Мар'я — не.

— Ну сабралася, — кажа, — дык прыходзь, пакуль саму не адпелі.

(Значыць, «камплімент» за «камплімент». Абмяняліся.)

Але ж з радасці, што кабета жывая, баба Ганна падхапіла свайго «канька» (гэта значыць, кавеньку) і «праз магазін» (трэба ж гасцінцаў купіць — хоць на адну тую дзясятку) рушыла да таварышкі.

Яны добра пасядзелі тады. Час ад часу казалі адна адной: «Вып'ем, кумка, вып'ем тут, на тым свеце не дадуць...» і чокаліся (вядома ж, не карвалолчыкам). Пра многае пагаварылі. І пра вірус — таксама, каб яму там пуста было!

А з іншага боку, каб не ён, дык, можа, і не сустрэліся б?

С. Кузняцоў, *Быхаўскі раён.*

КУПАННЕ «САМСУНГА»

...Гэтую сямейную пару, Алу і Канстанціна, я ведаю даўно. Паважаныя людзі. Ён — былы міліцыянер — выйшаў на пенсію і гадоў з дзесяць яшчэ працаваў у камунальнай гаспадарцы. Яна таксама адпачываць не спяшаецца, бо хоча і дзецям дапамагчы, і ўнукаў парадаваць, прычым не толькі нейкімі падарункамі ды прысмакамі.

У горадзе, у кватэры Ала з Канстанцінам толькі прапісаны, а жывуць у асноўным на дачы. У іх там — сапраўдны райскі куток! Дай божа, колькі працы, душы і грошай укладзена! Затое цяпер такая прыгажосць, што вачэй не адвесці. Дыхтоўны вясковы дом, безліч яблынь і груш, ягадных кустоў, а ўжо на клумбах і градах — дык чаго толькі няма!..

Карацей, руплівыя гаспадары і надзвычай гасцінныя. З адкрытай душой прымаюць то родных, то сяброў, то проста знаёмых, і гасцям тады не да віна з гарэлкай, — яны налюбавацца не могуць усім, што бачаць, нацешыцца размовамі...

Праўда, у тую нядзелю гасцей чамусьці не было, неадкладнай работы — як быццам таксама. Вось гаспадыня і захацела адпачыць: пайшла парыбачыць — з вудай пасядзець на блізкім возеры.

Праз нейкі час і гаспадар падцягнуўся — захацеў паглядзець, ці клюе...

А як толькі наблізіўся, — зразумеў: нешта пайшло не так, бо сядзіць яго Ала на кладцы і што — плача?

— Ты чаго? Што зрабілася? — спытаў у яе. — Нехта пазваніў? (Мабільнік Ала заўсёды насіла з сабой).

— Не, — усхліпнула жонка, — ніхто... І ўжо не пазвоніць, бо ў мяне тэлефона няма... У возера зваліўся... Можа, нырні, пашукай яго?..

«Ага, зараз — іголку ў стозе сена, — моўчкі выдыхнуў муж, бо возера ў іх сапраўды глыбокае. Ён аднойчы кувалду «ўтапіў», і тое не знайшоў! А тут — можна сказаць, цацка, маленькі тэлефон».

Але ж і праўда, ён грошай каштуе... І жонку шкада.

Давялося раздзецца да трусоў, нырнуць адзін раз, потым — зноў і зноў.

«Купаўся», карацей, пакуль не ссінеў ад холаду, пакуль не зазлаваў, не спытаў у жонкі:

— Табе што даражэй, я ці тэлефон? Можа, прасцей будзе новы купіць?

— Але ж там кантакты, — заныла Ала. — Як я іх аднаўлю?

І сапраўды — праблема!

Але ж тут Канстанцін успомніў, што ў аднаго суседа па дачы можна ласты ўзяць і маску для падводнага плавання...

У іх таксама «наплаваўся» — да знямогі, можна сказаць...

Не дапамагло.

— Давай я набяру Алін нумар, — прапанаваў той сусед. — Мабільнік зазвоніць — можа, знойдзеш па гуку?

— А навошта? Яго ж пад вадою замкне і ўсё — кранты, — не згадзіўся з прапановай Косця. — Зараз нырну яшчэ раз, але апошні.

24	ВСЕГО обязательства	120		4 106 850	3 840 776
25	СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ				
26	Уставный фонд	1211		261 326	261 327
27	Эмиссионный доход	1212		-	-
28	Резервный фонд	1213		41 479	27 169
29	Фонды переоценки статей баланса	1214		87 066	96 694
30	Накопленная прибыль	1215		189 570	201 148
31	ВСЕГО собственный капитал	121		579 441	586 338
32	ИТОГО обязательства и собственный капитал	12		4 686 291	4 427 114

Форма 2

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ
на 1 июля 2020 г.

Наименование банка **ОАО «Белинвестбанк»**

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	2020 год	2019 год
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011		156 786	153 161
2	Процентные расходы	2012		65 487	70 744
3	Чистые процентные доходы	201		91 299	82 417
4	Комиссионные доходы	2021		65 510	61 193
5	Комиссионные расходы	2022		25 183	18 522
6	Чистые комиссионные доходы	202		40 327	42 671
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203		5	7
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204		351	4 422
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205		16 962	10 883
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206		-	-
11	Чистые отчисления в резервы	207		55 228	39 930
12	Прочие доходы	208		16 895	11 904
13	Операционные расходы	209		90 563	82 007
14	Прочие расходы	210		7 435	7 075
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211		12 613	23 292
16	Расход (доход) по налогу на прибыль	212		1	5
17	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2		12 612	23 287

Председатель Правления А.С.Бриштелев

Директор департамента организации бухгалтерского, налогового учета и отчетности – заместитель главного бухгалтера Н.Г.Ткачёва

Промежуточная (квартальная) индивидуальная бухгалтерская (финансовая) отчетность по состоянию на 1 июля 2020 г. размещена на интернет-сайте ОАО «Белинвестбанк» **https://www.belinvestbank.by/about-bank/finance-statistic/nsfo**

146
www.belinvestbank.by

Открытое акционерное общество «Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк», 220002, г. Минск, пр. Машерова, 29. УНП 807000028.

Лицензия на осуществление банковской деятельности Национального банка Республики Беларусь № 3 от 15.01.2019

СКАНВОРД



ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Па гарызанталі: Патранташ. Машына. Клерк. Залп. Раб. Дзіда. Одум. Барана. Сука. Аркада. Мапед. Матрац. Кана. Амін. Верашчака. **Па вертыкалі:** Ачаг. Трыштамп. Накід. Епіскап. Краб. Збор. Лгун. Дата. Мара. Аер. Самшыт. Адмова. Дранік. Ткач. Рама. Цана.

Склаў Юрый ФАЛІНСКІ, *г. Мінск.*

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.11	21.21	16.10
Віцебск —	4.54	21.17	16.23
Магілёў —	5.01	21.11	16.10
Гомель —	5.05	21.00	15.55
Гродна —	5.27	21.35	16.08
Брэст —	5.35	21.28	15.53

Месяц

Маладзік 20 ліпеня. Месяц у сузор'і Дзевы.

Імяніны

Пр. *Алены, Вольгі.*
К. *Вольгі, Міхаліны, Хрысціны, Антона, Барыса, Войцеха.*

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

ЗАЎТРА



Даты Падзеі Людзі

24 ЛІПЕНЯ

У краіне

1820 год — нарадзіўся Люцыян Крашэўскі, беларускі мастак, фатограф. Скончыў Свіслацкую гімназію, Дэрпцкі ўніверсітэт. Жыў у радавым маёнтку каля Пружан. Удзельнік паўстання 1863—1864 гадоў, за дапамогу яго ўдзельнікам сасланы ў Пермскую губерню. Пасля заканчэння ссылкі пасяліўся ў Варшаве. Ілюстраваў творы свайго брата Юзафа Крашэўскага. Адлюстроўваў асаблівасці жыцця Польшчы, Беларусі і Літвы напярэдадні паўстання. Стаў адным з першых польскіх фатографаў і фотарэпарцёраў.

1885 год — нарадзіўся Міканор Казіміравіч Ярашэвіч, беларускі грамадска-палітычны дзеяч, аграном, педагог. Адзін з аўтараў праекта стварэння ў Мінску ўніверсітэта. У 1920-м быў прызначаны першым рэктарам Беларускага політэхнічнага інстытута, адначасова выкладаў у Мінскім інстытуце народнай адукацыі, Беларускім рабочым тэхнікуме, выконваў абавязкі загадчыка аддзела Наркамата адукацыі БССР па прафесійна-тэхнічнай адукацыі. Тройчы быў арыштаваны.

1915 год — нарадзіўся Пётр Мікалаевіч Суркоў, удзельнік вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза. Загінуў у 1944-м пры вызваленні горада Калінкавічы.

1950 год — нарадзілася Людміла Мікалаеўна Сінельнікава, беларуская і расійская балерына, заслужаная артыстка Беларусі.

1970 год — нарадзілася Алена Антонаўна Гаявая, артыстка балета, заслужаная артыстка Беларусі.

1995 год — у Мінску адбылася афіцыйная цырымонія адкрыцця будынкаў пасольстваў Вялікабрытаніі і Італіі ў Рэспубліцы Беларусь.

У свеце

1860 год — нарадзіўся Альфонс Муха, чэшскі жывапісец, дэкаратар, графік, заснавальнік і майстар тэатральнай і рэкламнай афішы ў стылі мадэрн, у прыватнасці стылю ар-нуво.

1935 год — нарадзіўся Лэс Рыд (Лэслі Дэвід Рыд Ове), англійскі кампазітар, аранжыроўшчык, музыкант, лідар светлавога аркестра. Аўтар шматлікіх папулярных песень, у тым ліку папулярных у Савецкім Саюзе твораў «Апошні вальс» і «Дылайла». Кавалер ордэна Брытанскай імперыі.

1945 год — у Патсдаме падчас канферэнцый кіраўнікоў урадаў СССР, ЗША і Вялікабрытаніі прэзідэнт ЗША Гары Трумэн паведаміў Сталіну аб стварэнні ў ЗША атамнай бомбы.

1950 год — ажыццёўлены першы баявы пуск ракеты з касмадрома на мысе Канаверал (ЗША).

Так гаварыў...

ЯКУБ КОЛАС:

«Хоць шмат на свеце ёсць маны,
Для праўды ж — не — няма труны:
З вады ўсплыве яна і з мроку».

УСМІХНЕМСЯ

Песімісты ўсяго свету перакананыя: калі дарогу перайшла чорная кошка, быць бядзе. А аптымісты кажуць — глупства, гэта перафарбаваная кошка.

— Калі вы пагодзіцеся, каб я пасмажыў яечню на вашым сале, я дазволю вам зварыць ваша мяса ў маім супе.

Выходзячы з будынка гарадскога суда, адвакат паварочваецца да свайго кліента, які выглядае вельмі засмучаным, і пытаецца:

— У чым справа?! Вас жа цалкам апраўдалі.

— Так-такі яно так, але ж цяпер я дакладна ўліп. Я здаў сваю кватэру ў арэнду на тры гады...

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі — 287 18 81.

прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79,
e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 2245.

Нумар падпісаны ў 19.30 23 ліпеня 2020 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

24 ліпеня 2020 г. № 27 (563)

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

ТЭМА ТЫДНЯ

СПАРТЫЎНАЯ КРАІНА —

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗДАРОВАЯ НАЦЫЯ

За гады незалежнасці Беларусь трывала замацавалася сярод лідараў міжнароднага алімпійскага руху і ўваходзіць у дваццатку наймацнейшых спартыўных дзяржаў свету. Спорт у нашай краіне выконвае цэлы шэраг сацыяльна значных місій. Гэта фундамент здароўя нацыі, школа мужнасці і таварыства, кузня найлепшых чалавечых якасцяў, адна з найважнейшых формаў выхавання юнага пакалення.

стар. 4

З НАГОДЫ

НЯМА ЛЕПШАГА ЗА БРЭСТ?

Тэлеграм-канал кіраўніка горада ў кантэксце самакіравання

СТАРШЫНЯ Брэсцкага гарвыканкама Аляксандр РАГАЧУК стварыў свой тэлеграм-канал і ўпершыню выйшаў да падпісчыкаў 15 ліпеня. І калі пачаткам стасункаў стала інфармацыя пра перанесены на наступны год Дзень горада, падумалася, што вось будзе яшчэ адзін афіцыйны орган гарвыканкама — накшталт газеты, толькі ў сацыяльных сетках. Але першае маё ўражанне аказалася памылковым.

Ужо на наступны дзень мэр падзяліўся зводкай аб колькасці шпіталізаваных і выпісаных з бальніц з каранавірусам. Першых было 37, а другіх — 84. Варта сказаць, што да гэтага падобную інфармацыю наогул ніхто не агучваў, гараджане карысталіся чуткамі ды паспяхова множылі іх. Дарэчы, сам старшыня таксама не пазбегнуў каварнай інфекцыі і перанёс двухбаковую пнеўманію. Сваім падпісчыкам з гэтай нагоды паведаміў, што ў яго лексіконе цяпер ёсць новае слова «сатурацыя», бо трэба сачыць за ўзроўнем насычэння крыві кіслародам. А скрыншот зводкі па гарадской захваральнасці ён пракаментаваў словамі аб тым, што маленькая перамога не павінна прытупляць нашай пільнасці, варта сябе берагчы.

стар. 16

СЁННЯ Ў НУМАРЫ

Зваротная сувязь

Як агучаныя сенатарам праблемы мясцовага ўзроўню вырашаюцца ў рэгіёнах?

стар. 3

Корт замест коўзанкі

У ДЮСШ Акцябрскага раёна, што на Гомельшчыне, тэнісны корт уладкавалі на пляцоўцы для хакея і фігурнага катання.

стар. 4

Другі цэнтр горада

Базай для прафесіяналаў, трамплінам для пачаткоўцаў, культурным цэнтрам для жыхароў стаў вяслярны канал у Брэсце.

стар. 13

Навасёлле для шматдзетных

У Слуцку, што на Міншчыне, практычна вырашана пытанне забеспячэння вялікіх сем'яў жыллём.

стар. 16

Аплата анлайн

Хутка можна будзе разлічыцца за праезд са смартфона ва ўсім грамадскім транспарце Мінска.

стар. 16

СУПРАЦОЎНІЦТВА

Пункты судакранання

Парламентарыі Беларусі і Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў акцэнтуюць увагу на актывізацыі гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва дзвюх краін.

Пра гэта паведаміў старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАЧКОЎ.

У рэжыме відэаканферэнцыі прайшла сустрэча рабочай групы Нацыянальнага сходу Беларусі з групай сяброўства з беларускім парламентам, што створана ў Федэральным нацыянальным савеце ААЭ, падчас якой парламентарыі абмяняліся думкамі наконт развіцця міжпарламенцкага супрацоўніцтва.

— Будзем рабіць акцэнт на пошуках новых шляхоў актывізацыі гандлёва-эканамічнага, інвестыцыйнага супрацоўніцтва. Упэўнены, парламентарыі абедзвюх краін знойдуць формы, якія дазволяць яго інтэнсіфікаваць, — адзначыў перад сустрэчай у гутарцы з журналістамі Сяргей Рачкоў, які ўзначальвае групу сяброўства ў беларускім парламенце.

Ён паведаміў, што ў Нацыянальным сходзе распрацавалі праект праграмы ўзаемадзеяння і накіравалі яго калегам з ААЭ. Яго мэта — актывізаваць узаемадзеянне на міжнародных, міжпарламенцкіх пляцоўках, у прыватнасці ў Міжпарламенцкім саюзе. Таксама падчас сустрэчы была звернута ўвага на рэалізацыю дамоўленасцяў, якія былі дасягнуты паміж краінамі на вышэйшым і высокім узроўнях. Нагадаем, летась адбыўся першы ў гісторыі двухбаковых адносін візіт у нашу краіну спадчыннага прынца Абу-Дабі, намесніка Вярхоўнага галоўнакамандуючага Узброеных Сіл ААЭ шэйха Мухамеда бен Заіда аль-Нахаяна. Такія візіты плённыя для абодвух бакоў, бо накіраваны на развіццё не толькі палітычнага, але і гандлёва-эканамічнага, і інвестыцыйнага супрацоўніцтва. Так, узаемны тавараабарот па выніках 2019 года вырас на 45 % і дасягнуў 105 мільёнаў долараў. Большую частку гэтай сумы склаў беларускі экспарт — больш за 85 мільёнаў, — ён павялічыўся ў параўнанні з 2018-м амаль на 50 %. Акрамя таго, летась ААЭ займалі чацвёртую прыступку па аб'ёмах інвестыцый у беларускую эканоміку: лічба ўкладанняў перавысіла 118 мільёнаў долараў.

Трэба сказаць, што групы сяброўства у Нацыянальным сходзе Беларусі і Федэральным нацыянальным савеце ААЭ створаны параўнальна нядаўна. Кіраўнік беларускай групы ўпэўнены, што дзейнасць парламентарыяў дазволіць інтэнсіфікаваць узаемадзеянне па ўсіх кірунках: гандлёва-эканамічным, інвестыцыйным, палітычным. Сяргей Рачкоў падкрэсліў, што працэс пошуку пунктаў судакранання будзе працягнуты ў тых сферах, дзе інтарэсы абодвух бакоў супадаюць.

СТРЫМ НА ПУБЛІЦЫ ЦІ ПРЫВАТНАЯ РАЗМОВА?

Новы фармат зносін у выглядзе адказаў на пытанні карыстальнікаў сацсетак у рэжыме анлайн працягвае практыкаваць віцэ-спікер Савета Рэспублікі Анатоль ІСАЧАНКА.

У пятніцу, 17 ліпеня, намеснік старшыні верхняй палаты парламента, нацыянальны каардынатар па дасягненні Мэт устойлівага развіцця ў прамым эфіры адказваў на пытанні, якія яму агучвалі карыстальнікі папулярных сацсетак. Трэба сказаць, што для свайго чарговага стрыму Анатоль Міхайлавіч абраў не свой рабочы кабінет (як гэта было першы раз), а маляўнічы краявід аднаго з паркаў актыўнага адпачынку і этнаграфіі, што знаходзіцца на Міншчыне.

Падчас прамога эфіру Анатоль Ісачанка адзначыў, што Беларусь мае вялікія дасягненні і іх неабходна захаваць. Віцэ-спікер верхняй палаты парламента падкрэсліў недапушчальнасць арганізацыі несанкцыянаваных мерапрыемстваў, якія ствараюць небяспеку для жыцця тысяч грамадзян, і ўдзелу ў іх. «Любыя перамены павінны быць мірнымі і накіраванымі ў першую чаргу на карысць людзей», — пераканаў Анатоль Ісачанка.

Ён таксама звярнуў увагу на істотнае адрозненне паміж свабодай і ўсёдазволенасцю ў выражэнні свайго меркавання. «Мы жывём у суверэннай незалежнай краіне. Менавіта мы, грамадзяне Беларусі, вызначаем сваю будучыню», — падкрэсліў намеснік старшыні Савета Рэспублікі, адказваючы на адно з пытанняў падчас стрыму.

Трэба сказаць, што прамыя эфіры ў сацыяльных сетках сталі новай формай узаемадзеяння членаў Савета Рэспублікі з інтэрнэт-супольнасцю. Падчас мінулага, другога, стрыму Анатолю Ісачанку задалі каля 30 пытанняў па актуальных тэмах жыцця грамадства і дзяржавы.

Як падкрэслілі ў прэс-службе Савета Рэспублікі, падобная практыка ў верхняй палаце парламента будзе працягвацца і далей.

«Унікальная форма зносін для нашых чыноўнікаў, — звярталі ўвагу карыстальнікі ў сваіх каментарыях. — За смеласць і адкрытасць — асобны дзякуй! Такі фармат сапраўды варты ўвагі!»

Але не навацыямі адзінымі... На наступны дзень, у суботу 18 ліпеня, віцэ-спікер правёў традыцыйную прамую тэлефонную лінію для грамадзян, падчас якой 18 чалавек задалі свае пытанні. Звароты датычыліся якасці пітной вады ў вёсцы Забалоцце Барысаўскага раёна, канфлікту з суседзямі з-за агароджы, пакосу травы ў сталіцы. Усе звароты ўзяты на кантроль.

Званілі і з прапановамі: напрыклад, кіраўнік адной з фермерскіх гаспадарак Валожынскага раёна расказаў аб праграме развіцця агра- і экатурызму ў раёне. Яе рэалізацыя, па словах заяўніка, дасць магчымасць стварыць новыя рабочыя месцы і палепшыць турыстычны імідж Міншчыны. Анатоль Ісачанка праграмай зацікавіўся і прапанаваў суразмоўніку даслаць яе канцэпцыю ў Савет Рэспублікі для дэталёвага вывучэння.

Па выніках прамой лініі намеснік старшыні верхняй палаты парламента адзначыў, што большая частка зваротаў знаходзіцца ў кампетэнцыі мясцовых улад. На яго думку, апошнім неабходна больш уважліва ставіцца да зваротаў людзей, падыходзіць індывідуальна, а не фармальна. «Нам усім трэба працаваць сумленна з максімальным плёнам», — падкрэсліў ён.

Падсумоўваючы дзве формы работы з людзьмі, Анатоль Ісачанка адзначыў на сваёй старонцы: «Падчас прамога эфіру ў сацсетках вялікая колькасць пытанняў датычылася тэмы выбарчай кампаніі, якая зараз праходзіць у краіне, а па выніках прамой тэлефоннай лініі ўсе пытанні былі звязаны з асабістымі і бытавымі праблемамі грамадзян. Гэта яскравы паказчык залішняй палітызацыі многіх працэсаў у грамадстве і дзяржаве. У той жа час жыццё ў краіне ідзе сваім парадкам».

Вольга АНУФРЫЕВА.

ВЫЯЗНЫ СЕМІНАР

ЗАХАВАЦЬ І ПРЫМНОЖЫЦЬ

Магілёўскі раён сёння вельмі дынамічна развіваецца — тут будуецца жылле, адкрываюцца новыя аб'екты гаспадарання, рэалізуюцца буйныя сацыяльныя праекты. Народныя абраннікі змаглі больш дэталёва азнаёміцца з карысным вопытам падчас выязнога семінара-нарады пад кіраўніцтвам старшыні Магілёўскага райсавета дэпутатаў Сяргея Ярошчанкі. Удзел у мерапрыемстве ўзялі член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Алег Дзячэнка, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Наталля Тарасенка, іншыя дэпутаты і прадстаўнікі выканаўчай ўлады. На прыкладзе канкрэтных населеных пунктаў, гаспадарак і вытворчасцяў яны паглядзелі, якіх поспехаў у сацыяльна-эканамічным плане дасягнуў раён за апошні час.

Палыкавічы — адзін з перспектыўных населеных пунктаў, дзе цяпер актыўна вядзецца будаўніцтва жылля і ўсёй неабходнай для камфортнага жыцця чалавека інфраструктуры. Аграгарадок ужо амаль прымыкае да Магілёва, з якім яго звязвае добрая транспартная сетка. Падчас яго наведвання **начальнік аддзела архітэктуры і будаўніцтва Магілёўскага райвыканкама Уладзімір Ігнатаў** азнаёміў прысутных з перспектывамі развіцця вёсак і аграгарадкоў у раёне. Наступным пунктам наведвання сталі перадавыя гаспадаркі раёна — агракамбінат «Зара» і «Авангард». **Першы намеснік старшыні Магілёўскага райвыканкама Алег Маслак** расказаў пра эфектыўнасць такога кірунку, як жывёлагадоўля, паведаміў пра інвестыцыі ў аграрную галіну. На базе гаспадаркі «СервалюксАгра» вялася гаворка пра інавацыйныя падыходы ў сельскай гаспадарцы з выкарыстаннем высокіх тэхналогій.

Сацыяльная бяспека грамадзян заўсёды была ў цэнтры ўвагі дэпутатаў. Гэтым разам яны пазнаёміліся з рэалізацыяй дзяржпраграмы «Чыстая вада» на прыкладзе аграгарадка Салтанаўка. У праграме дня было таксама наведванне школы, гадавальніка лясгаса, аб'ектаў бізнесу і культуры.

Пры падвядзенні вынікаў удзельнікі семінара абмеркавалі шэраг надзённых пытанняў, якія датычыліся перспектыў населеных пунктаў, выкарыстання сучасных тэхналогій вырошчвання пасадачнага матэрыялу, рэалізацыі праграмы «Чыстая вада», развіцця прадпрымальніцтва.

Знамянальна, што такія семінары з удзелам дэпутатаў Савета Рэспублікі і Палаты прадстаўнікоў, а таксама дэпутатаў мясцовых Саветаў становяцца традыцыйнымі. Іх мэта — выяўленне праблем і фарміраванне канкрэтных прапаноў па паляпшэнні жыцця людзей, а таксама вынясенне іх на рэспубліканскі ўзровень для замацавання нормамі заканадаўства.

— На прыкладзе вядучых сельскагаспадарчых прадпрыемстваў Магілёўскага раёна, іншых аб'ектаў мы пераканаліся, як дынамічна развіваецца беларуская эканамічная мадэль, — адзначыў Алег Дзячэнка. — Нашы сельгасвытворцы скарысталіся дзяржаўнай падтрымкай і сёння цалкам забяспечваюць харчовую бяспеку краіны. На фоне вось гэтых станоўчых прыкладаў асабліва негатыўна ўспрымаюцца ўсе тыя спробы радыкальных палітычных сіл прынізіць нашы дасягненні ў аграпрамысловай галіне, сферы культуры, адукацыі, аховы здароўя. У няпростай сітуацыі, якая склалася ў краіне, дэпутацкаму корпусу неабходна больш актыўна ўключыцца ў інфармацыйную работу з выбаршчыкамі. Нам трэба на справе абараніць наш суверэнітэт, незалежнасць і тэрытарыяльную цэласнасць Беларусі, каб перадаць нашчадкам спадчыну, якая, як казаў наш народны паэт Янка Купала, засталася нам ад прадзедаў.

Нэлі ЗІГУЛЯ.
Фота з архіва Алега ДЗЯЧЭНКІ.

Выяўляльны прынцып дапамагае загадзя здымаць пытанні, якія хвалююць людзей

Такую думку выказаў старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктар ЛІСКОВІЧ па выніках прыёму грамадзян, які ён правёў у аўторак, 21 ліпеня.

— Калі выяўляльны прынцып эфектыўна функцыянуе ва ўсіх сферах жыццядзейнасці чалавека, гэта гарантуе каласальнае зніжэнне колькасці зваротаў да органаў улады, — упэўнены сенатар. — Таму што людзі павінны ведаць, на што могуць разлічваць: напрыклад, рамонт дарогі, фасада, атрыманне дапамогі — сутнасць пытання значэння не мае, але чалавеку трэба сказаць загадзя, а не чакаць, пакуль ён звернецца са сваёй праблемай.

Для гэтага члены Савета Рэспублікі сустракаюцца з людзьмі ў сваіх рэгіёнах, бо верхняя палата парламента фарміруецца па тэрытарыяльным прадстаўніцтве: актыўныя зносіны на мясцовым узроўні дазваляюць бачыць праблемы людзей і дапамагаць у іх вырашэнні, што ў значнай ступені ўплывае на зніжэнне колькасці пытанняў, з якімі заяўнікі звяртаюцца непасрэдна ў Савет Рэспублікі.

У профільнай камісіі, якая складаецца з 14 сенатараў, прытрымліваюцца менавіта выяўляльнага прынцыпу ў рабоце са зваротамі грамадзян. Яе старшыня растлумачыў, што кожны прыватны зварот дае падставы ўбачыць тэнденцыі для правядзення маштабнай работы далей па ведамствах, каб у будучым пазбегуць з'яўлення аналагічных зваротаў.

— Сённяшні прыём паказаў, наколькі эфектыўна запрашаць рэспубліканскія і мясцовыя органы дзяржкіравання для больш дэтальнага разгляду сутнасці звароту і адразу прымаць рашэнне, у якім кірунку далей разглядаць зварот, ці даць адпаведнае тлумачэнне заяўніку, — адзначыў Віктар Лісковіч.

Гаворка тут пра канфліктную сітуацыю, якая склалася ў саіскальніка на статус кандыдата навук з вышэйшай атэстацыйнай камісіяй. Дысертацыйная работа была выканана, прайшла адпаведныя этапы абароны, і на фінальнай прыступцы эксперты разышліся ў думках адносна яе актуальнасці, навізны і метадалагічных аспектаў. Наступны магчымы крок — падача заявы ў апеляцыйную камісію. Калі ж яе рашэнне будзе адмоўным, ёсць падставы для вырашэння пытання ў судзе.

Прадстаўнікі ВАКа растлумачылі, што кожны год каля 500 прэтэндэнтаў на званне кандыдата навук, каля паўсотні — дактароў навук праходзяць праз гэтую ўстанову. Сярод іх ёсць тыя, хто здымае сваю кандыдатуру самастойна, калі ёсць падставы для ўдасканалення дысертацыйнай работы. Яны паспяхова абараняюць свае дысертацыі паўторна і атрымліваюць адпаведныя навуковыя званні.

— Калі работа дайшла да вышэйшай атэстацыйнай камісіі і не праходзіць экспертызу на завяршальным этапе, трэба было прымаць адпаведныя карэкціроўкі на папярэднім узроўні ў той вышэйшай навучальнай установе, дзе яна выконвалася і праходзіла ўсе этапы абароны, — упэўнены старшыня профільнай камісіі. — Таму гэты зварот даў нам нагоду задумацца над выніковасцю і якасцю дысертацыйных работ. Прынцыповасць ВАКа паказвае слабыя месцы вышэйшай школы.

Акрамя гэтага пытання, на прыёме грамадзян быў агучаны зварот, які датычыўся закрыцця вясковай крамы з прычыны яе нерэнтабельнасці і неабходнасці пракладкі некалькіх соцень метраў дарогі ў адным з пасёлкаў Маладзечанскага раёна. Віктар Лісковіч паабяцаў заяўнікам асабіста разабрацца з пытаннем з выездам на месца. Дэталёва з праблемай вяскоўцаў ён пазнаёміцца ў найбліжэйшы час.

Падсумоўваючы вынікі правядзення прыёму грамадзян, сенатар у размове з журналістамі адзначыў, што ў Савеце Рэспублікі на сённяшні дзень дастаткова выразна пабудавана работа па зваротах грамадзян, і гэта пацвярджаюць лічбы: за паўгоддзе ў верхняй палаце парламента зарэгістравана каля 2,5 тысячы такіх зваротаў.

— Кожны мае права ў любой форме (пісьмовай, вуснай, электроннай) звярнуцца са сваім пытаннем. Дзе можна дапамагчы, мы вырашаем пытанні станоўча, і такіх прыкладаў шмат. Самае галоўнае, каб адказ быў не фармальны, а аб'ектыўны і справядлівы, — лічыць Віктар Лісковіч.

Вольга АНУФРЫЕВА.
Фота аўтара.

У СВАЁЙ АКРУЗЕ

ТРЫ РАЁНЫ, ШЭСЦЬ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ

І ўсё гэта на працягу аднаго дня: работа сенатара ў сваёй акрузе патрабуе максімальнай аддачы

На мінулым тыдні старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктар ЛІСКОВІЧ наведаў Шчучынскі, Лідскі і Іўеўскі раёны Гродзеншчыны. У полі зроку парламентарыя апынуліся прадпрыемствы розных сфер дзейнасці: аграпрамысловай накіраванасці, перапрацоўчай галіны, культурна-асветніцкай сферы... І ўсё дзеля таго, каб на месцы пачуць і ўбачыць, чым жыве рэгіён і што хвалюе яго жыхароў.

З ходам жніва атрымалася ўвачавідкі пазнаёміцца ў Жалудку. Работнікаў тамтэйшага агракомплексу цікавілі пытанні развіцця іх населенага пункта. На ўзроўні мясцовай улады тут прымаюцца захады па паляпшэнні ўмоў жыцця вяскоўцаў: ёсць планы па мадэрнізацыі бальніцы, рэканструкцыі вуліцы Чырвонаармейскай, рамонце дзіцячага садка.

На сельскагаспадарчым комплексе па вырошчванні шампіньёнаў «Логал-Бія» гаворка ішла пра перспектывы далейшага развіцця вытворчасці, якая з'явілася тут два гады таму і дала магчымасць працаўладкаваць больш за 200 чалавек. Сёння тут штомесяц вырошчваецца да 410 тон свежых грыбоў. Тэма вытворчага патэнцыялу была працягнута і на сустрэчы з калектывам ААТ «Лідахлебапрадукт» — ды і ў цэлым тэма рэгіянальнага развіцця, якой таксама цікавіліся супрацоўнікі Лідскага замка. Наогул, Ліда як прамысловы і турыстычны цэнтр мае ўсе падставы, каб стаць флагманам у гэтым кірунку ў найбліжэйшай перспектыве.

Прадстаўнікоў вытворчай сферы — калектыў Іўеўскага філіяла прадпрыемства «Лідатэхмаш» — хвалявала пытанне пашырэння вытворчасці: плошчаў ужо не хапае, некалькі гадоў таму пабудавалі зборачны цэх, узводзіцца зварачны. Работнікі чакаюць яго ўводу, бо гэта значна палепшыць умовы іх працы. А супрацоўнікі адзінага ў Беларусі музея нацыянальных культур, што ў Іўі, зацікаўлены ў прыцягненні турыстаў і развіцці паклоннага турызму. Усе гэтыя сферы інтарэсаў былі агучаны падчас сустрэчы.

— Я рэгулярна наведваю рэгіён, знаёмлюся з рознымі сферамі дзейнасці, з людзьмі, якія тут жывуць і працуюць. Такія сустрэчы вельмі карысныя, каб пачуць і ўбачыць, наколькі сёння выкарыстанне тых ці іншых законаў, якія рэгламентуюць наша жыццё, эфектыўнае. На такіх сустрэчах мы бачым, што зроблена добра, што трэба выправіць, а што — тэрмінова змяніць, — адзначыў па выніках рабочага візіту Віктар Лісковіч.

У цэлым, як падсумаваў старшыня профільнай камісіі, Гродзеншчына заўсёды радуе тым, колькі тут зроблена і працягвае рабіцца для жыхароў і самімі жыхарамі. У кожным дасягненні — вялікі ўнёсак многіх людзей.

Вольга АЛЯКСАНДРАВА.

ЗВАРОТНАЯ СУВЯЗЬ

КАМФОРТНА І ПРЫГОЖА!

Гомельскі аблвыканкам даў справаздачу аб прынятых мерах у адказ на звароты грамадзян

Так, жыхары пасёлка Іпуць Гомельскага раёна будуць мець магчымасць скарыстацца паслугамі лазні. У цяперашні час, паведамляецца ў лісце Гомельскага абласнога выканаўчага камітэта на адрас Савета Рэспублікі, праведзена ўстаноўка мабільнай квадрасаўны на аўтамабільны прычэп МЗСА.

Пра тое, што пуск мабільнай лазневай установкі ў тэставым рэжыме адбыўся, разлік кошту паслуг складзены, а абслуговы персанал накіраваны на атэстацыю ў аблвыканкам, паведамілі таксама і заяўніцы — жыхарцы населенага пункта Галавінцы Гомельскага раёна Валянціне Смаль.

Як расказалі ў прэс-службе верхняй палаты парламента, жанчыне таксама былі дадзены адказы па шэрагу іншых праблемных пытанняў, выкладзеных у яе звароце.

Акрамя гэтага, ёсць і іншыя прыклады станоўчага вырашэння праблем, агучаных заяўнікамі на ўзроўні Савета Рэспублікі.

Так, у нядаўнім лісце Гомельскага выканкама паведамляецца, што камунальным жыллёвым рамонтна-эксплуатацыйным унітарным прадпрыемствам «Чыгуначнае» выкананы работы па лакальным бягучым рамонце калідора агульнага карыстання на шостым паверсе інтэрната, што месціцца ў абласным цэнтры па вуліцы Савецкай, 167.

У лісце таксама сцвярджаецца, што адказ на зварот быў дадзены заяўніку, які жыве ў гэтым жа інтэрнаце, і што ў апошняга прэтэнзій да выкананых рамонтных работ не засталося.

Аўтобус да «сотак», няякасны рамонт і жыццё начнога горада

23 заяўнікі змаглі агучыць свае пытанні падчас традыцыйнай суботняй прамой лініі, якую правёў старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў Ігар ЖУК.

Людзей хвалявалі розныя пытанні: ад стандартных са сферы жыллёва-камунальнай гаспадаркі да сезонных накшталт прафілактычнага адключэння гарачай вады і курсіравання маршрутаў грамадскага транспарту да садовых таварыстваў.

Як падкрэслілі ў гутарцы з карэспандэнтам «МС» у облсавеце, у летні перыяд назіраецца змяншэнне колькасці зваротаў: калі ў лютым, напрыклад, рэгістравалася звыш 30 пытанняў, дык цяпер іх становіцца менеей. Між іншым, гэта звязана не толькі з сезоннасцю, але і з аператыўным рэагаваннем на наяўныя (і магчымыя) звароты грамадзян, калі работа ідзе на апярэджанне: улады імкнуцца прадбачыць праблемы, якія могуць паўстаць, і загадзя ліквідуюць іх. Акрамя таго, узровень інфармаванасці насельніцтва значна вырас. Жыхары вобласці ведаюць, якая работа праводзіцца і на якой стадыі знаходзіцца вырашэнне той ці іншай праблемнай сітуацыі.

— Узровень даступнасці органаў улады сапраўды высокі. Любы можа звярнуцца са сваёй праблемай, і не толькі падчас тэлефонных ліній. Прамыя кантакты з людзьмі дапамагаюць вырашаць праблемы. Усе звароты аналізуюцца. Гэта дазваляе прымаць правільныя рашэнні, аптымізаваць і ўдасканальваць вырашэнне пытанняў жыццезабеспячэння насельніцтва. Акрамя гэтага, прамыя лініі — паказчык даверу грамадзян да ўлады: людзі ведаюць, што ім дапамогуць. Ёсць пытанні і праблемы, якія мы павінны і можам вырашаць вельмі аператыўна. Яны не патрабуюць сур'ёзных фінансавых і рэсурсных выдаткаў. Больш складаныя і комплексныя аналізуюцца і ўключаюцца ў рэгіянальныя планы мерапрыемстваў, абласную інвестыцыйную праграму, — адзначыў старшыня аблсавета.

Што датычыцца праблем, агучаных падчас цяперашняй прамой лініі, дык яны большай часткай тэрытарыяльна адносіліся да абласнога цэнтра: гродзенцы цікавіліся тэмай капітальнага рамонту дамоў, яго якасцю — напрыклад, Ігару Жуку паведамілі, што ёсць факты нядобрасумленнага выканання работы, калі пасля яе завяршэння дах і навес пад'езда працякаюць. Жыхары гістарычнай часткі горада скардзіліся на шумнае суседства з барам, наведвальнікі якога не лічацца з правам тутэйшых на паўнавартасны сон па начах. Гродзенцы з іншых мікрараёнаў звярталі ўвагу на навядзенне парадку на дваровых тэрыторыях і добраўпарадкаванне дзіцячых пляцовак.

Тэлефанавалі і жыхары раённых цэнтраў. Жанчына са Шчучына паведаміла, што паблізу дома на вуліцы Зялёнай перарытая дарога, і яе доўгі час не прыводзяць у парадак. Звярталіся грамадзяне і з іншымі пытаннямі добраўпарадкавання, напрыклад, наконт устаноўкі лавак і навядзення парадку. Ні адзін званок не застаўся па-за ўвагай, запэўнілі ў аблсавеце. Па частцы пытанняў тлумачэнні былі дадзены падчас тэлефоннай размовы. Адзін зварот узяты на кантроль. Датычыўся ён падаўжэння маршруту аўтобуса, што курсіруе з абласнога цэнтра да вёскі Сухая Даліна Гродзенскага раёна, побач з якой знаходзіцца адно з садовых таварыстваў. Жанчына паскардзілася, што ад прыпыначнага пункта да яе дому трэба ісці каля двух кіламетраў, а гэта нязручна. Ігар Жук запэўніў заяўніцу, што аб тым, як мясцовыя ўлады плануюць вырашыць гэтае пытанне, яе праінфармуюць у хуткім часе.

Вольга АЛЯКСАНДРАВА.

СПАРТЫЎНАЯ КРАІНА — ЗДАРОВАЯ НАЦЫЯ

Здаровы спосаб жыцця — візітоўка Беларусі

Здароўе людзей, развіццё фізічнай культуры і спорту абвешчаны ў Беларусі прыярытэтным кірункам сацыяльнай палітыкі. Пытанні арганізацыі фізкультурна-аздараўленчай работы з насельніцтвам і развіццё масавага спорту знаходзяцца ў цэнтры ўвагі Прэзідэнта. Па статыстыцы, больш за 2 мільёны беларусаў сістэматычна займаюцца фізічнай культурай і спортам, а гэта звыш 22 % ад агульнай колькасці насельніцтва. Штогод у краіне для прыхільнікаў здаровага спосабу жыцця праводзіцца каля 22 тысяч спартыўных мерапрыемстваў. Традыцыйнымі ўжо сталі фізкультурна-спартыўныя спаборніцтвы «Беларуская лыжня», Усебеларускае фізкультурна-спартыўнае свята, прысвечанае Дню Незалежнасці, Мінскі паўмарафон і іншыя мерапрыемствы. Адроджана сістэма рэспубліканскіх галіновых спартакіяд. Штогод у краіне праводзіцца больш за 100 турніраў для дзяцей і падлеткаў, у тым ліку рэспубліканскія спаборніцтвы па футболе «Скураны мяч», па гандболе «Імклівы мяч», па біятлоне, лыжных гонках і стральбе з пнеўматычнай зброі «Снежны снайпер», а таксама агульнанацыянальны хакейны турнір на прызы Прэзідэнцкага спартыўнага клуба «Залатая шайба».

Асаблівая ўвага звяртаецца на ўдасканаленне фізічнага выхавання дзяцей і моладзі. Па ўсёй краіне для іх арганізуюцца падлеткавыя спартыўныя клубы. У Беларусі працуюць навучальныя цэнтры для падрыхтоўкі прафесійных спартсменаў, у тым ліку Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт фізічнай культуры, вучылішчы алімпійскага рэзерву, спецыялізаваныя школы алімпійскага рэзерву, дзіцяча-юнацкія спартыўныя школы. Падрыхтоўку юных спартсменаў ажыццяўляюць 464 арганізацыі фізічнай культуры і спорту, у тым ліку 11 сярэдніх школ-вучылішчаў алімпійскага рэзерву і 453 спецыялізаваныя вучэбна-спартыўныя ўстановы. У названых арганізацыях праходзяць спартыўную падрыхтоўку каля 160 тысяч юных спартсменаў.

Усяго ж будучых спартсменаў рыхтуюць па 28 алімпійскіх відах спорту і 36 відах, якія не ўваходзяць у праграму галоўных стартаў чатырохгоддзя. Дарэчы, за ўсю гісторыю незалежнай Беларусі 280 ураджэнцаў нашай краіны сталі чэмпіёнамі свету і Еўропы ў многіх відах спорту.

Важная роля ў стварэнні неабходных умоў для развіцця спорту ў Беларусі, падтрымцы пачаткоўцаў, перспектыўных маладых спартсменаў належыць Прэзідэнцкаму спартыўнаму клубу. З 2005 года ён стаў арганізатарам і партнёрам больш чым 150 міжнародных турніраў. Зрабіліся стыпендыятамі клуба, а гэта значыць атрымалі добрую матэрыяльную дапамогу, звыш тысячы спартсменаў і трэнераў Беларусі, якія прадстаўляюць больш за 40 відаў спорту.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Аб'екты для спорту і здароўя

Сёння ў Беларусі культывуецца звыш 130 відаў спорту. Спартсмены ўсіх гэтых відаў маюць умовы для правядзення трэніровак і спаборніцтваў. Прэзідэнт краіны і Нацыянальнага алімпійскага камітэта Аляксандр Лукашэнка з першых дзён сваёй дзейнасці на пасадзе кіраўніка дзяржавы і НАК адным з прыярытэтных кірункаў вызначыў будаўніцтва ва ўсіх рэгіёнах краіны спартыўных установаў, у якіх маглі б не толькі трэніравацца і спаборнічаць прафесійныя спартсмены, але і займацца спортам з карысцю для здароўя ўсе, хто пажадае.

Пік пабудовы спартыўных аб'ектаў прыпаў на 2004—2014 гады. Штогод у сярэднім па краіне адкрываецца да 30 новых залаў, чатырох плавальных басейнаў, 37 спартыўных пляцовак. З умацаваннем матэрыяльна-тэхнічнай базы спартыўнае жыццё ў краіне атрымала новы магутны імпульс. Сёння ў Беларусі функцыянуе больш за 23 тысячы фізкультурна-спартыўных збудаванняў (у тым ліку больш за 25 буйных комплексаў). У іх ліку — каля 150 стадыёнаў, 340 басейнаў (разам з міні-басейнамі — больш за 900), 55 спартыўных манежаў, 4517 спартыўных залаў, 36 спартыўных збудаванняў са штучным лёдам. Кожны абласны цэнтр Беларусі мае ўласны палац спорту і крытую лядовую пляцоўку. Усё больш буйных аб'ектаў будуецца ў рэгіёнах. За апошнія гады ўведзены ў эксплуатацыю фізкультурна-аздараўленчыя комплексы ў Беразіне, Барысаве, Стоўбцах, Чэрвені, Брэсце, Століне, у гарадскім пасёлку Краснаполле Магілёўскай вобласці, пасёлку Раубічы Мінскай вобласці; спартыўны комплекс для гульнявых відаў спорту з лыжароллернай трасай у Оршы; стадыёны ў Баранавічах, Лідзе і іншыя збудаванні. Грамадзяне атрымалі рэальную магчымасць умацоўваць сваё здароўе, павялічваць фізічны і духоўны патэнцыял, удасканальваць спартыўнае майстэрства.

Для прафесійных спартсменаў і аматараў у Беларусі нямала спартыўных комплексаў сусветнага класа. Сярод іх — РЦАП па зімовых відах спорту «Раўбічы», РЦАП «Стайкі», РЦАП коннага спорту і конегадоўлі ў Ратамцы, вяслярныя каналы ў Брэсце і Заслаўі, гарналыжны комплекс-курорт «Лагойск», Рэспубліканскі гарналыжны цэнтр «Сілічы», шматфункцыянальныя спартыўна-відовішчныя комплексы «Мінск-Арэна» і «Чыжоўка-Арэна», Палац спорту «Уручча». Важна, што гэтыя аб'екты з'яўляюцца запатрабаванымі.

Перамогі як імідж дзяржавы

Адным з кірункаў дзейнасці спартыўнай галіны, які развіваецца вельмі дынамічна, сталі прыцягненне і арганізацыя правядзення на тэрыторыі Беларусі найбуйнейшых міжнародных спартыўных спаборніцтваў. Толькі за апошні час адбыліся такія буйныя спартыўныя мерапрыемствы, як чэмпіянаты свету па хакеі, веласіпедным спорце на трэку, летнім біятлоне, тайландскім боксе, паўэрліфтынгу, чэмпіянаты Еўропы па мастацкай гімнастыцы, самба, боксе, індархакеі, шахматах і многія іншыя міжнародныя спаборніцтвы. Адным з самых яркіх спартыўных мерапрыемстваў мінулага года ў свеце сталі II Еўрапейскія гульні, якія прымаў Мінск. Усе гэтыя турніры былі арганізаваны на высокім узроўні, што адзначана сусветнай спартыўнай грамадскасцю, а гэта вельмі спрыяльна ўплывае на імідж і аўтарытэт Беларусі ў свеце і дапамагае развівацца турыстычнай галіне краіны.

У Беларусі прыняты заканадаўчыя акты і забяспечаны ўдзел дзяржавы ў развіцці і фінансаванні фізічнай культуры і спорту, будаўніцтве і ўтрыманні спартыўных збудаванняў, аздараўленчых цэнтраў, спартыўных клубаў, падрыхтоўцы спецыялістаў у галіне фізічнай культуры і спорту, атлетаў высокага класа. Паспяховыя выступленні нашых спартсменаў на міжнароднай арэне сведчаць пра тое, што Беларусь багатая на выдатныя спартыўныя таленты, што ў краіне створаны ўсе ўмовы для іх росту і развіцця.

Беларускія спартсмены ўдзельнічаюць у Алімпійскіх гульнях з 1952 года, а самастойнай камандай яны пачалі выступаць там з 1994-га. За гэты час лік медалёў падыходзіць да ста. Назаўжды ў памяці беларускіх балельшчыкаў застанецца першае алімпійскае «золата», якое заваявала для суверэннай краіны Кацярына Карстэн, «золата» Аляксея Грышына — першага ў гісторыі беларускага спорту чэмпіёна зімовых Алімпійскіх гульняў, сенсацыйная перамога на стаметроўцы бягунні з Брэста Юліі Несцярэнка, перамога Сяргея Мартынава, які ўстанавіў на Алімпіядзе новы сусветны рэкорд.

Гонар і павагу выклікаюць і высокія вынікі беларускіх параалімпійцаў, якія з усіх міжнародных стартаў абавязкова вяртаюцца з узнагародамі. У нашай краіне штогод каля 25 тысяч чалавек становяцца інвалідамі ў працаздольным узросце, і яшчэ больш за чатыры тысячы робяцца інвалідамі ва ўзросце да 18 гадоў. На жаль, частка з іх знаходзіцца ў самым пачатку свайго жыцця або ў яго росквіце, таму прыцягненне інвалідаў да заняткаў спортам і фізічнай культурай разглядаецца як адзін з фактараў сацыялізацыі асоб з абмежаванымі магчымасцямі. Сёння ў краіне дзейнічаюць федэрацыі інваліднага спорту, больш за 25 клубаў, 70 фізкультурна-аздараўленчых секцый. Спортам займаюцца каля 50 тысяч інвалідаў. Найбольшая перавага аддадзена наступным відам: лёгкая атлетыка, плаванне, стральба з лука, біятлон, міні-футбол, шахматы, шашкі, танцы на інвалідных каляскі, веласпорт, лыжныя гонкі, дзюдо, фехтаванне.

> Усё больш буйных аб'ектаў будуецца ў рэгіёнах. За апошнія гады ўведзены ў эксплуатацыю фізкультурна-аздараўленчыя комплексы ў Беразіне, Барысаве, Стоўбцах, Чэрвені, Брэсце, Століне, у гарадскім пасёлку Краснаполле Магілёўскай вобласці, пасёлку Раубічы Мінскай вобласці; спартыўны комплекс для гульнявых відаў спорту з лыжароллернай трасай у Оршы; стадыёны ў Баранавічах, Лідзе і іншыя збудаванні.

Адным з найважнейшых этапаў развіцця інваспорту з'яўляецца падрыхтоўка трэнерскіх і медыцынскіх кадраў для работы са спартсменамі-інвалідамі. На базе ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт фізічнай культуры» арганізавана падрыхтоўка спецыялістаў па спецыяльнасцях «Фізічная рэабілітацыя і эргатэрапія», а таксама «Аздараўленчая і адаптыўная фізічная культура».

Заняткі спортам і дасягненне пэўных вынікаў дапамагаюць інвалідам пераадольваць тыя цяжкасці, з якімі яны сутыкаюцца ў паўсядзённым жыцці. Інвалідны спорт яшчэ раз даказвае, што яго ўдзельнікі — паўнавартасныя грамадзяне. Яны робяць свой унёсак у развіццё спорту і павышаюць міжнародны прэстыж краіны. За шматгадовую гісторыю беларускія спартсмены з абмежаванымі магчымасцямі выступілі на дзесяці Паралімпійскіх гульнях, дзе заваявалі 124 медалі, з іх 39 залатых.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

ГОМЕЛЬШЧЫНА

КУЗНЯ БУДУЧЫХ ПЕРШЫХ РАКЕТАК

У дзіцяча-юнацкай спартыўнай школе Акцябрскага раёна цяпер ёсць уласны тэнісны корт

Летась на тэрыторыі ўстановы была ўладкавана пляцоўка для хакея і фігурнага катання. Аднак у сувязі з умовамі надвор'я сёлетняй зімой апрабаваць яе не атрымалася: з-за плюсавых тэмператур коўзанку не змаглі заліць. А нядаўна вырашылі з максімальнай аддачай выкарыстаць пляцоўку ў летні час і даць новы імпульс развіццю сямейнага спартыўнага руху ў Акцябрскім раёне. Прастору пераабсталявалі ў тэнісны корт. Памер яе — 20 на 40 метраў.

Напракат можна ўзяць ракеткі для гульні ў вялікі тэніс і мячыкі. У школе падкажуць правілы, пракансультуюць па ўсіх тэхнічных нюансах.

У дзіцяча-юнацкай спартыўнай школе падкрэслілі, што гаворка не пра прафесійны ўзровень гульні ў вялікі тэніс, а пра аматарскі. Але не выключана, што для кагосьці корт у Акцябрскім можа стаць пляцоўкай для старту ў вялікі спорт.

Увогуле ж у мясцовай дзіцяча-юнацкай спартыўнай школе адкрыты тры аддзяленні: грэка-рымскай барацьбы, лёгкай атлетыкі і бокса. У іх займаюцца 130 юных спартсменаў.

Таксама ў ДЮСШ створаны ўсе ўмовы для актыўнага падтрымання здаровага спосабу жыцця. Акцэнт зроблены ў тым ліку на арганізацыю сямейнага спорту.

У спектры паслуг — наведванне трэнажорнай, спартыўнай і барцоўскай зал, гульня ў більярд, настольны тэніс, паслугі фітнесу, аздараўленчае плаванне, саўна. Можна таксама ўзяць напракат турыстычны інвентар.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

На адной хвалі

ПАДАРУНАК З «ЧАРОЎНАГА КУФЭРКА»

На гэтым тыдні ў рубрыцы «Чароўны куфэрак», што выходзіць у межах праграмы для дзяцей і падлеткаў «Дасціпныя. Нястомныя. Кемлівыя» на хвалях канала «Культура» Беларускага радыё, пачалі чытаць першыя старонкі аповесці Янкі Маўра «ТВТ». Гэты твор, які ўбачыў свет у 1934 годзе, з'яўляецца папярэднікам гайдараўскай кнігі «Цімур і яго каманда» (выйшла ў 1940-м).

Прачытаўшы аповесць упершыню, школьнікі трыццатых гадоў мінулага стагоддзя па прыкладзе яе герояў стваралі свае «таварыствы ваяўнічых тэхнікаў», — менавіта так расшыфроўваецца абрэвіятура «ТВТ» — каб змагацца «супраць улады рэчаў». Ці патрэбна гэта сучасным дзецям? Героі «ТВТ» прышываюць гузікі і цыруюць шкарпэткі, разбіраюцца з электрапрыборамі і збіраюць смецце. Займаючыся такімі, на першы погляд, дробязямі, дзеці вучацца праяўляць ініцыятыву, уважліва глядзець навокал і не баяцца эксперыментаў.

«Янка Маўр як сапраўдны псіхолаг не ператварыў гісторыю «ТВТ» у ружовую карцінку суцэльнага трыумфу, — мяркуе **дырэктар канала «Культура» Уладзімір ТРАПЯНОК.** — Кожнаму з герояў даводзіцца перажываць няўдачы, але яны працягваюць сваю гульню. Тое, што «ТВТ» у першую чаргу гульня, таксама сведчыць пра талент Маўра-педагога. Ён не імкнецца ўзвальваць на дзяцей завялікую адказнасць, не прыдумвае для іх звышскладаных задач. І менавіта таму аповесць «ТВТ» застаецца запатрабаванай і ў наш час».

Слухаць аповесць «ТВТ» у выкананні артысткі Лікі Пташук юныя слухачы могуць з аўторка да пятніцы ў 16.05 на хвалях канала «Культура». Праграма таксама гучыць у паўторы ў 10.05 наступнага дня (за выключэннем суботы і нядзелі), а яе запісы захоўваюцца на працягу месяца ў архіве на сайце www.radiokultura.by.

Алена ДРАПКО.

ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 99

Аўтар наступнай задачы — Васіль Бачай з горада Камянец Брэсцкай вобласці ***(гл. дыяграму).***

Белыя: Крf2, Фg4, Лf3, Сc7, Сh1, Кc5 (6).

Чорныя: Крa8, Лh8, Сb7, Сb8, Кd8, пп. b4, h2 (7).

Мат за 2 хады.

Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі («Звязда», вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, Мінск, 220013) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

У чарговых анлайн-турнірах на сайце chess.com Уладзіслаў Кавалёў заняў 10-е месца з 826 удзельнікаў, 7-е з 879 і 25-е са 130, а на сайце lichess.org — 2-е з 76.

Зборная Беларусі да 16 гадоў у анлайн-матчы саступіла аднагодкам з Азербайджана.

У мінулым выпуску мы згадвалі, што Міжнародная шахматная федэрацыя праводзіць у ліпені—жніўні сусветную анлайн-алімпіяду. Зборная кожнай краіны павінна мець шэсць удзельнікаў, у тым ліку не менш за дзве жанчыны, па юніёры і юніёрцы да 20 гадоў. Усе каманды разбіты на некалькі дывізіёнаў, а найлепшыя з іх працягнуць барацьбу на наступным этапе. Цікава, што арганізатары вырашылі не называць спаборніцтва алімпіядай па шахматах, бо анлайн-правілы маюць некаторыя адрозненні ад звыклай шахматнай гульні за дошкай.

* * *

Як ужо ведаюць нашы пастаянныя чытачы, чэмпіён свету Магнус Карлсен зладзіў чарговы анлайн-турнір з удзелам 12 наймацнейшых гросмайстраў. Пасля папярэдніх спаборніцтваў (у дзвюх групах) адбыліся матчы стадыі плэй-оф. Першае месца ў выніку заняў Карлсен. Вось як у фінальным паядынку ён абмяняўся ўдарамі з галандскім гросмайстрам.

Магнус Карлсен — Аніш Гіры. 1. e4 c5 2. Kf3 d6 3. Cb5+ Kd7 4. a4 Kf6 5. Kc3 g6 6. a5 Cg7 7. 0-0 a6 8. Ce2 0-0 9. Le1 b5 10. ab6 Cb7 11. d3 K:b6 12. e5 Kfd5 13. K:d5 K:d5 14. ed ed 15. c3 Le8 16. Cd2 Фb6 17. Фc2 a5 18. h3 Cc6 19. d4 cd 20. K:d4 Kb4 21. cb C:d4 22. ba C:f2+ 23. Крf1 Фd4 24. Ф:c6 C:e1 25. C:e1 Ф:b2 26. Cf3, 0:1.

Магнус Карлсен — Аніш Гіры. 1. d4 Kf6 2. c4 e6 3. Kf3 d5 4. Kc3 c5 5. cd K:d5 6. e4 K:c3 7. bc cd 8. cd Cb4+ 9. Cd2 C:d2+ 10. Ф:d2 0-0 11. Cc4 Kd7 12. 0-0 b6 13. Лad1 Cb7 14. Лfe1 Лc8 15. Cb3 Le8 16. Le3 Kf6 17. d5 ed 18. e5 Ke4 19. Фe1 Фc7 20. Kd4 a6 21. h4 Лcd8 22. f3 Kc5 23. h5 Ke6 24. Kf5 d4 25. Лed3 Kc5 26. Л:d4 Л:d4 27. Л:d4 K:b3 28. Фg3 g6 29. ab Лd8 30. e6 Фc1+ 31. Крh2 Л:d4 32. e7 Фc8 33. Фe5 Лh4+ 34. Крg3, 1:0.

* * *

Аграмадны будынак вяслярнага цэнтра змясціў у сабе адміністрацыйны корпус, гасцініцу, кавярню, вялікі трэніровачны блок. Тут ёсць два вяслярныя басейны, тры трэнажорныя залы, адна з якіх выкарыстоўваецца выключна для прафесійных спартсменаў. Маюцца фітнес-зала, 25-метровы плавальны басейн, з якога пачынаюць заняткі спортам дзеці, медыцынскі блок. Такім чынам, спартсмен можа забяспечыць сябе ўсім, нават не выходзячы на вуліцу.

На брэсцкім канале трэніруюцца многія вядомыя беларускія спартсмены. Не раз тут бываў Раман Петрушэнка. У мінулыя гады нярэдкім госцем станавілася і славутая Кацярына Карстэн. Акрамя таго, што сама спартсменка выходзіла на дыстанцыі спаборніцтваў, яна была своеасаблівым сімвалам для пачаткоўцаў. Атрымаць узнагароду з рук легенды беларускага веславання для юных — найвышэйшая форма заахвочвання.

Працаваць на імідж

Цэнтр папаўняе свой бюджэт з дапамогай басейна, трэнажорных залаў, якія наведваюць гараджане. Прыблізна трэцяя частка калектыву — супрацоўнікі пазабюджэтных ставак. Цэнтрам праводзіцца цэлы шэраг розных мерапрыемстваў культурнай, сацыяльнай і, вядома, спартыўнай тэматыкі. Іх мэта — працаваць на імідж, заяўляць пра сябе, рабіць аб'ект пазнавальным і вядомым для шырокай грамадскасці. Як паказала практыка, справа таго вартая. Напрыклад, у свой час вялікі рэзананс атрымала мерапрыемства, якое можна назваць днём таты: заклікалі бацькаў з бліжэйшага мікрараёна прыйсці ў выхадны дзень з дзецьмі ды бясплатна пазаймацца спортам, патрэніравацца. Тады прыйшло мноства маладых мужчын з сынамі і дочкамі, усе атрымалі шмат станоўчых эмоцый. Некаторыя адразу запісаліся ў басейн, трэнажорную залу. Моладзь любіць вяслярны канал як месца цікавых канцэртаў, флэшмобаў, дабрачынных акцый. Для мікрараёна вялікі спартыўны аб'ект стаў і галоўным культурным аб'ектам. Менавіта тут, на судзейскай вышцы, з'явілася гарадская славутасць — трубач, які абвяшчае поўдзень. Ну а калі летась над вадою прайшло вячэрняе шоу з нагоды тысячагоддзя горада, вяслярны канал стаў пазнавальным не толькі ў Брэсце.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

ГРОДЗЕНШЧЫНА

«ЛІДАР» СПАРТЫЎНАГА ЖЫЦЦЯ

Сучасны комплекс для адпачынку, алімпійскіх перамог і канцэртаў

Лыжароллерная 1,5-кіламетровая траса ў гарадскім парку, спартыўна-біятлонны комплекс «Сялец» са стрэльбішчам і сістэмай штучнага аснежвання, два стадыёны, лёгкаатлетычны манеж. Дзве дзіцяча-юнацкія спартыўныя школы і Гродзенская міжраённая СДЮШАР прафсаюзаў, вучні якіх ніколі не вяртаюцца са спаборніцтваў без медалёў. Спаборніцтвы па 16 відах спорту, рэспубліканскія турніры... Сёлета гэтыя спартыўныя здабыткі Навагрудчыны папоўніліся новым фізкультурна-аздараўленчым комплексам «Лідар».

Спартсменам, журналістам, музыкантам...

Спартыўная зала з трыбунамі на 751 месца, 25-метровы басейн, залы для заняткаў барацьбой, лёгкай атлетыкай, фітнесам, «трэнажорка», кавярня і нават спецыяльнае памяшканне для работы журналістаў унутры комплексу. Пляцоўкі для пляжнага футбола, валейбола, комплекс для варкаўта і пост Асвода — звонку. «Лідар» цалкам абсталяваны не толькі пад жаданні аматараў здаровага і актыўнага адпачынку, але і пад патрэбы тых наведвальнікаў, якім неабходны спецыяльныя ўмовы: ліфт, пандусы, спецыяльны пад'ёмнік, які можна перасоўваць па ўсёй плошчы басейна...

— У Навагрудскім раёне даўно марылі пра такое збудаванне, таму месца пад комплекс выбіралі загадзя і невыпадкова. Гэта буйны маладзёжны мікрараён, які працягвае пашырацца. А яшчэ дзесяць гадоў таму былі балоты ды пустэча. Як толькі сталі з'яўляцца жылыя дамы, навакольную тэрыторыю таксама пачалі добраўпарадкоўваць, — згадвае **Сяргей ЧАРТКО, начальнік упраўлення спорту і турызму Навагрудскага райвыканкама**. — За гэты час надалі высакароднасці нашаму азярцу, што побач з комплексам, зрабілі спартыўныя пляцоўкі, стварылі пост Асвода для бяспечнага плавання. У выніку з'явілася добрае месца адпачынку і засталася вольная прастора акурат для спартцэнтра.

Навагрудчына падарыла краіне не аднаго ўдзельніка Алімпійскіх гульняў па біятлоне, грэка-рымскай барацьбе, лёгкай атлетыцы. Гэта, у прыватнасці, Аляксандр Грабовік, адзін з найлепшых барцоў грэка-рымскага стылю, Людміла Ананька, вядомая біятланістка, удзельніца двух алімпіяд, чэмпіёнка свету і Еўропы, і многія іншыя. Добрыя вынікі паказваюць і падлеткі на першынствах свету сярод юніёраў. А ўсё таму, што шанцуе з трэнерамі — усе яны адданыя сваёй справе, працуюць на перспектыву.

На Гродзеншчыне гэта трэці спартыўны комплекс падобнага кшталту. Два аб'екты ўжо збудаваны ў Астраўцы і Лідзе, адзін мяркуецца ў Слоніме. Праўда, навагрудчане перабудавалі ўнутраную частку будынка, зыходзячы са сваіх патрэб.

— Кожны метр памяшканняў зрабілі карысным, каб не прастойвалі без справы, — удакладняе Сяргей Чартко. — Закупілі, напрыклад, спецыяльнае пакрыццё, якое можна выкарыстоўваць у спартзале, каб не пашкодзіць падлогу, — і ў будучым можна ладзіць тут нейкія мерапрыемствы, тыя ж дыскатэкі, канцэрты. А ў холе другога паверха з часам з'явіцца мінібібліятэка, бо ў мікрараёне пакуль няма такой установы.

Аквааэробіка і ўрокі для школьнікаў

Адным з найбольш чаканых месцічамі аб'ектаў «Лідара» стаў басейн, дзе з'явілася магчымасць займацца аквааэробікай. Дагэтуль на ўвесь горад быў толькі басейн завода газавай апаратуры, які знаходзіцца на ўскрайку Навагрудка. Цяпер жа ўсе найноўшыя спортпрылады можна знайсці значна бліжэй да цэнтра.

Басейн знутры выкладзены не кафляй, а спецыяльным пакрыццём блакітнага колеру, якое і ваду робіць прыгажэйшай, і для плыўцоў больш бяспечнае, бо мякчэйшае. Вада ачышчаецца вадкім хлорам і ўльтрафіялетам.

Не меншую цікавасць выклікае і фітнес. Яшчэ да адкрыцця комплексу 200 ахвотных ужо запісаліся на заняткі. Мноства бацькоў маюць намер вадзіць сюды дзетак, каб навучыць іх плаваць. А ўсе школьныя гадзіны, якія адведзены на заняткі па плаванні, будуць праходзіць тут.

— У комплексе функцыянуюць аддзяленні футбола, валейбола, лёгкай атлетыкі, а праз год плануем адкрыць яшчэ і аддзяленне плавання для школьнікаў. Гэта дазволіць адбіраць найлепшых для прафесійнага навучання. Чэмпіёнам стане не кожны, аднак здароўе набудуць усе, — абяцае **Сяргей ЮШКЕВІЧ, дырэктар комплексу і Навагрудскай ДЮСШ № 2**, для якой «Лідар» стаў шматфункцыянальнай базай.

Прыпыняць удасканаленне спартыўнага жыцця тут і не думаюць. На вуліцы каля «Лідара» плануецца зрабіць яшчэ футбольнае поле, тэнісны корт і поле для лёгкаатлетаў, каб кідаць молат, капʼё, дыск.

Ужо распрацаваны і праект праектна-каштарыснай дакументацыі на лыжароллерную трасу другой чаргі спартыўна-біятлоннага комплексу «Сялец». Калі работы выканаюць, разам з існуючым кругам, працягласць трасы тут стане 3,3 кіламетра. Хочуць узвесці на комплексе і асобны будынак спартыўнага прызначэння, каб дзецям было зручней трэніравацца.

Ірына СІДАРОК, фота аўтара.

Ад варкаўтаў да мега-комплексаў

Толькі летась на Гродзеншчыне пабудавана і мадэрнізавана паўсотні спартыўных аб'ектаў

ЗГОДНА са статыстыкай, фізкультурай займаецца кожны пяты жыхар рэгіёна. Пры гэтым у вобласці вызначаны і прыярытэтныя кірункі. У некаторых з іх, такіх як барацьба, цяжкая і лёгкая атлетыка, гродзенцы маюць трывалую школу і добрыя поспехі на сусветнай арэне. Сёння ёсць намер узняць на новы ўзровень гімнастыку, веласпорт і пляжныя гульні. Як Гродзеншчына будзе дамагацца новых спартыўных вышынь? Пра гэта ішла размова з начальнікам упраўлення спорту і турызму Гродзенскага аблвыканкама Алегам АНДРЭЙЧЫКАМ.

Замяніць старыя пляцоўкі

Хоць вобласць мае добрую спартыўную базу — больш за тры тысячы спартыўных збудаванняў, — многія з іх патрабуюць удасканалення. Гэта звязана з новымі падыходамі ў спорце. Напачатку ўзяліся за стадыёны. Работа па мадэрнізацыі ідзе ў Ваўкавыску — там з'явяцца сучаснае пакрыцце, лёгкаатлетычныя дарожкі. У рамках трансгранічнага праекта вядзецца рэканструкцыя стадыёна ў Шчучыне. Пачалася мадэрнізацыя цэнтральнага стадыёна «Нёман» у Гродне. Там кладзецца пакрыццё апошняга пакалення, якое менш траўманебяспечнае.

— Таксама не забываем пра звычайныя пляцоўкі — за пяць гадоў іх зроблена больш за 30. Яны невялікія, з добрым штучным пакрыццём. Разам з тым вядзецца ўстаноўка вулічных трэнажораў. За пяцігодку пастаўлена больш за 40 комплексаў, на якіх можна праводзіць паўнавартасныя трэніроўкі. Гэтым шляхам мы будзем ісці надалей, бо варкаўты запатрабаваны, — лічыць суразмоўнік.

Усяго за мінулы год у вобласці пабудавана і мадэрнізавана каля 50 спартыўных аб'ектаў.

З «Імпульсам», «Лідарам» і тэнісным кортам

У вобласці ідуць па шляху стварэння буйных спартыўных комплексаў, якія дазваляюць адначасова ахапіць вялікую колькасць аматараў фізкультуры і спорту. У пачатку года ўступіў у строй комплекс «Імпульс» у горадзе атамшчыкаў — Астраўцы, а зусім нядаўна адкрыўся фізкультурна-аздараўленчы комплекс у Навагрудку «Лідар».

Як расказаў Алег Андрэйчык, цяпер у Гродне ідзе будаўніцтва вялікага тэніснага цэнтра з чатырма закрытымі кортамі і двума адкрытымі. Гэта корты новага пакалення, якія ўзводзяцца на аснове лёгкай паветраапорнай канструкцыі. Гродзенцы першыя ў краіне пачалі выкарыстоўваць падобныя тэхналогіі — такім чынам тут пабудаваныя хакейны комплекс і футбольны манеж. Аб'ект хутка ўзводзіцца і даволі эканамічны. Таксама ў горадзе дзейнічае дзіцячая спартыўная школа тэніса, а з уводам тэніснага цэнтра дзеці будуць трэніравацца круглы год.

У планах — будаўніцтва ў Гродне вялікага спартыўнага комплексу па гульнявых відах спорту з асноўнай арэнай, трыбунамі на дзве тысячы месцаў, трэніровачнымі заламі і лёгкаатлетычным манежам, дзе можна праводзіць спаборніцтвы самага высокага ўзроўню. Пакуль такога аб'екта ў вобласці няма, хоць калектываў, якія выступаюць на сур'ёзным узроўні, нямала: гэта і каманда па хакеі на траве «Рытм», і чатыры баскетбольныя каманды вышэйшай лігі, і валейбольная каманда, і гандбольная. Яны павінны мець сваю пляцоўку, лічыць Алег Андрэйчык. Тут можна будзе праводзіць заняткі аматараў, зборы камандаў з суседніх краін, міжнародныя турніры. Менавіта лагістыка стала прычынай стварэння праекта, ідэя якога ўзнікла яшчэ ў 1980-я гады і вось у наступныя некалькі гадоў павінна здзейсніцца.

Стаўка на веларух, плаванне і пляжны спорт

Гродзенцы пачынаюць пашыраць спартыўны дыяпазон. Тут звярнулі ўвагу на плаванне. Імкліва развіваецца і адпаведная база: плавальныя басейны з'явіліся ў Астраўцы, Навагрудку. Летась у Мастах пасля доўгага перапынку адкрыты басейн, летам такі ж аб'ект будзе здавацца пасля рэканструкцыі ў Смаргоні. Зараз праектуецца спартыўна-забаўляльны цэнтр з комплексам басейнаў у Слоніме. Плануецца, што ён будзе будавацца ў наступным годзе. Як зазначыў кіраўнік абласнога спартыўнага ведамства, усе новыя школы цяпер узводзяцца з басейнамі.

Імкліва развіваецца ў краіне веларух. Рэгіён можна лічыць першапраходцам у гэтым кірунку. За пяць гадоў у вобласці абсталявана больш за 150 кіламетраў веламаршрутаў, якія адпавядаюць усім міжнародным стандартам. Іх сетка расце, на траціну павялічылася пракатная база. Развіваецца не толькі звычайны веларух, але і спартыўны, у тым ліку маўнцінбайк. Для гэтага створана адпаведная траса ў парку актыўнага адпачынку «Каробчыцкі Алімп». Тут, дарэчы, трэніруецца нацыянальная зборная. Таксама будуецца траса для дзіцячых трэніровак.

Выходзіць на новы ўзровень пляжны спорт. Днямі комплексы пляцовак для пляжных гульняў адкрыты на тым жа «Каробчыцкім Алімпе», на турыстычнай базе «Прывал», а ўвогуле ўзводзяцца ў кожным раёне. Як зазначыў суразмоўца, днямі ў Шчучыне адбудзецца фінал чэмпіянату Рэспублікі Беларусь па пляжным футболе, дзе за першае і трэцяе месца будуць спаборнічаць каманды Гродзенскай вобласці. Сёння палову зборнай каманды Беларусі складаюць гульцы Прынёманскага рэгіёна.

Медальны рэкорд

Летась вобласць устанавіла свой рэкорд — за год на міжнародных чэмпіянатах было заваявана 92 медалі. Папярэдні рэкорд 2015 года быў пабіты амаль удвая. Як паведаміў Алег Андрэйчык, вельмі шмат з'явілася маладых амбіцыёзных спартсменаў, здольных дасягнуць высокіх вынікаў. Сёння Гродзеншчына — гэта радзіма не толькі славутых Вольгі Корбут, Івана Ціхана, Аляксандра Курловіча, Яніны Карольчык, Канстанціна Лукашыка, Івана Ядэшкі, Андрэя Барбашынскага. Успыхваюць новыя зоркі, такія як Яўген Каралёк — двухразовы чэмпіён свету на велатрэку, Алег Юрэня — леташні чэмпіен свету па веславанні на байдарках і каноэ, і іншыя.

Рэгіён прэтэндуе на самае вялікае прадстаўніцтва сярод абласцей краіны на летніх Алімпійскіх гульнях у Токіа, якія маюць адбыцца ў будучым годзе. У спісах кандыдатаў амаль 60 спартсменаў у 13 відах спорту. Заваявана восем ліцэнзій — у легкай атлетыцы, веславанні на байдарках, плаванні, гімнастыцы. Дарэчы, у Гродне ўзнаўляецца славутая школа гімнастыкі: калісьці тут зіхацелі Корбут і Ваўчэцкая, а на II Еўрапейскіх гульнях бронзавым прызёрам стала гродзенская гімнастка Настасся Алістратава. Моцныя пазіцыі рэгіён мае па вольнай і грэка-рымскай барацьбе: больш за палову складу нацыянальнай зборнай у гэтых відах спорту менавіта за гродзенцамі.

— Мы першымі з рэгіёнаў пайшлі па шляху матывацыі і стымулу для спартсменаў, — падкрэсліў суразмоўца. — Прынята рашэнне абласнога Савета дэпутатаў аб выдзяленні 125 імянных стыпендый для перспектыўных маладых спартсменаў, якія атрымліваюць іх штомесяц на працягу года. Яшчэ 80 стыпендый выплачваюцца з мясцовага бюджэту раёнамі вобласці.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

МІНШЧЫНА

СТУПЕНІ ПОСПЕХУ,

або Як на Мядзельшчыне рыхтуюць чэмпіёнаў

Тут так прызвычаіліся да поспехаў юных весляроў і лыжнікаў са спецыялізаванай дзіцяча-юнацкай школы алімпійскага рэзерву раёна, што перамогі на абласных і нават рэспубліканскіх спаборніцтвах успрымаюць без асаблівых эмоцый. Неаднойчы былі поспехі і на міжнародным узроўні.

Фота Аляксандра ВЫОШКАГА.

Найбольш яркім дасягненнем стаў бронзавы медаль вясляркі Алёны Лапцік на чэмпіянаце Еўропы ў Румыніі. Як расказалі ва ўстанове, за апошнія гады ўдзельнікамі чэмпіянатаў Еўропы былі весляры Аляксей Махніст і Аляксей Талочка, у фінальнай частцы чэмпіянату Еўропы па валейболе ў складзе нацыянальнай зборнай гуляў Пётр Мінянкоў. Удзельнічаў у чэмпіянаце свету па лыжных гонках Аляксандр Малько. Няблага для не самага вялікага раёна, праўда? Хоць ва ўстанове лічаць, што можна працаваць і яшчэ лепш. Так бы мовіць, ёсць куды расці.

З верасня мінулага года да традыцыйных для Мядзела аддзяленняў лыжных гонак ды веславання на байдарках і каноэ дадалося аддзяленне лёгкай атлетыкі. «Бо, па-першае, — тлумачыць **дырэктар установы Андрэй МАЛЬКО**, — у раёне ёсць стадыёны з сучасным пакрыццём (мядзельскі гарадскі і сярэдняй школы ў курортным пасёлку Нарач), па-другое, якраз па гэтай спецыяльнасці закончыў універсітэт наш выхаванец, і мы зрабілі на яго запыт. Па-трэцяе, лёгкая атлетыка дае магчымасць праявіць сябе вялікай колькасці дзяцей: хтосьці — спрынтар, нехта — кідальнік молата або дыска... Амаль кожнае дзіця ў гэтым відзе спорту можа знайсці сваю нішу. Да таго ж па лёгкай атлетыцы праводзіцца шмат спаборніцтваў, яна не патрабуе вялікіх выдаткаў і даступная ў любую пару года». У 2019/2020 навучальным годзе аддзяленне функцыянавала на базе агульнаадукацыйных школ раёна — у курортным пасёлку Нарач, аграгарадках Будслаў, Занарач і Сырмеж. І ўжо ёсць перамогі на першынствах Мінскай вобласці ў эстафеце, бегу на дыстанцыі 800 метраў і спартыўнай хадзе.

Андрэй Малько і сам выпускнік гэтай школы. Вярнуўся сюды трэнерам, а ў 27 гадоў стаў дырэктарам.

Цяпер для выхаванцаў створаны ўсе ўмовы: у Мядзеле ёсць фізкультурна-аздараўленчы цэнтр, арганізавана наведванне басейна, кожны забяспечаны інвентаром. Што, канешне, вельмі добра. Але, сцвярджае Андрэй Малько, не гэта ў першую чаргу вызначае поспех. Выхаванцы спецыялізаванай дзіцяча-юнацкай школы заўсёды, на працягу дзесяцігоддзяў, паказвалі добрыя вынікі — нават тады, калі з інвентаром было значна горш. Бо ўсё ж галоўная ўмова спартыўных дасягненняў — жаданне трэнера і яго выхаванца перамагаць ды працаваць дзеля гэтай перамогі.

Дарэчы, пра трэнераў. Касцяк калектыву — колішнія выпускнікі гэтай жа школы. Усе амаль аднаго ўзросту — прыкладна 50 гадоў. Гэта людзі, якія прыйшлі сюды пасля заканчэння ВНУ і засталіся. А вось моладзь пасля абавязковай адпрацоўкі часта сыходзіць у нарачанскія здраўніцы, дзе вышэйшыя заробкі і не трэба дасягаць высокіх вынікаў.

На думку Андрэя Малько, са спортам звязаны вялікія перспектывы для Мядзельшчыны. Менавіта гэтая галіна дае магчымасць заявіць пра раён на сусветным узроўні. Бо для спартыўных дасягненняў не патрэбны ні карысныя выкапні, ні ўрадлівыя землі, ні вялікія фінансавыя ўкладанні. А ўсе ўмовы створаны, і людзі, якія могуць і жадаюць працаваць, у азёрным краі ёсць.

Наталля ЛІСІЦКАЯ.

ВІЦЕБШЧЫНА

ДЛЯ ФІГУРЫСТАЎ І ФУТБАЛІСТАЎ

На малой радзіме Шагала ідзе работа над стварэннем двух аб'ектаў, на якіх змогуць трэніравацца і спартыўныя зоркі.

Спецыялізаваная закрытая трэніровачная арэна для фігурыстаў будзе ўзведзена ў абласным цэнтры побач з ужо існуючым лядовым палацам. Ініцыятар будаўніцтва — беларуска-чэшскае прадпрыемства. Запланавана здача пад ключ ужо ў 2021 годзе. Неабходнасць узвядзення «малодшага сабрата» прадыктавана жыццём — эксплуатацыйная нагрузка Віцебскага лядовага палаца спорту, пабудаванага ў 1999-м, — у 1,7 разы большая за нарматыўную! Гэта стварае масу праблем. Напрыклад, бацькі маленькіх спартсменаў, якія трэніруюцца на каньках, расказвалі, што дзецям даводзіцца прачынацца літаральна ноччу, каб прыйсці на свабодны лёд. І да позняга вечара на арэне нешта адбываецца. У дырэкцыі з сумам канстатуюць, што ў чарзе па трэніроўкі тыя ж фігурысты, хакеісты, канькабежцы... Як паспець усіх задаволіць? Якасць лёду для некаторых відаў лядовага спорту — важная рэч, значыць, для яго падрыхтоўкі неабходны час. Ды яшчэ ж і гараджанам і гасцям горада трэба даць магчымасць пакатацца.

Таму новая лядовая пляцоўка вельмі неабходная! І будзе не проста каток па суседстве, а Цэнтр фігурнага катання на каньках Наталлі Бесцям'янавай і Ігара Бобрына. Славутая пара ўжо не раз асабіста была ў Віцебску з гэтай нагоды. Да Віцебска бліжэй з Масквы, разумее легенда спорту. Па сутнасці, у параўнанні з мегаполісамі гэта невялікі гарадок. Яго аўра вабіць сваёй утульнасцю, прыцішаным рытмам жыцця, ды і багатай гісторыяй. У планах — і запрашэнне вядомых фігурыстаў для трэніровак. У Маскве, калі каткі для профі закрываюцца на прафілактыку, ім даводзіцца далёка лятаць — у Віцебску ж з'явіцца магчымасць прымаць іх. Комплекс будзе ўнікальны ва ўсім былым СССР, сцвярджаюць легенды спорту. Прыблізная сума яго будаўніцтва эквівалентная двум мільёнам еўра, атрымана ад бізнесу. Спартыўны аб'ект з інтэлектуальнай начынкай стане цудоўным прыкладам дзяржаўнага-прыватнага партнёрства.

Што датычыцца крытага футбольнага манежа, то цікава, што ён будзе паветраапорны. Такі ж ёсць у Гродне.

Віцебск, між іншым, пакуль што адзіны абласны цэнтр, які не мае манежа, дзе можна гуляць у футбол круглы год.

Фота Алега КЛІМОВІЧА.

На гэтай пляцоўцы будзе футбольны манеж.

Трэба сказаць, што ён будуецца ў першую чаргу для патрэб дзіцячай-юнацкай спартыўнай школы. Спецыялісты лічаць, што ўжо 12-гадовыя павінны як мага часцей трэніравацца на стандартным футбольным полі. А што рабіць халоднай зімой? Вось і здзяйсняюцца мары.

Вядома, і дарослыя таксама змогуць тут трэніравацца. Для гульцоў у мяч з ліку прафесіяналаў новы стадыён, які паўстане побач з Цэнтральным спартыўным комплексам на праспекце Генерала Люднікава, таксама доўгачаканы.

Існуючае футбольнае поле без даху, дарэчы, будзе аб'яднана з новабудоўляй пераходнай галерэяй. Гэта зручна яшчэ і таму, што ў комплексе старога стадыёна ёсць кавярня, гатэль, трэніровачныя залы. Адпаведна, спадарожную інфраструктуру для новага аб'екта ствараць не трэба.

На момант падрыхтоўкі артыкула будаўнікі ўжо зрабілі маналітны фундамент, на ім — палатно для штучнага пакрыцця, ужо пачыналі работы па добраўпарадкаванні прылеглай тэрыторыі, азеляненні. Праблем з фінансаваннем і будаўнічымі матэрыяламі няма.

Аб'ект таксама, як і лядовы палац, стане будоўляй міжнароднага ўзроўню. Беларусы падрыхтавалі пляцоўку для таго, каб спецыялісты са Славеніі зрабілі надземную частку комплексу. Гарантыя яго надзейнай эксплуатацыі — трыццаць гадоў!

Інвестыцыі ў спорт акупяцца з лішкам. Як вядома, пры правільным падыходзе паспяховая будучыня ствараецца ўжо сёння.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Извещение о проведении открытого аукциона по продаже земельного участка в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в деревне Курмелёвка Каменского сельсовета Лепельского района Витебской области

ОРГАНИЗАТОР: КАМЕНСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

Лот	Месторасположение земельного участка, его площадь и кадастровый номер	Целевое назначение земельного участка	Условия и ограничения	Расходы по подготовке и изготовлению документации, рублей	Начальная цена, рублей	Сумма задатка, рублей (10 %)
	Витебская область, Лепельский район, Каменский с/с, д. Курмелёвка, ул. Центральная, У-7А, площадь – 0,2490 га, кадастровый номер – 222781707601000040	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (код – 1 09 02, земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним, квартиры в блокированном жилом доме), без изменения целевого назначения	Земельные участки, расположенные в водоохранных зонах рек и водоемов (озеро Ладосно), код – 2.4, площадь – 0,2490	-	1600,00	160,00

1. **Аукцион состоится 25 августа 2020 года в 15.00 по адресу:** Витебская область, Лепельский район, агрогородок Камень, улица Ленинградская, 25а.

2. Аукцион проводится в соответствии с Положением, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462 «О некоторых мерах по реализации Указа Президента Республики Беларусь от 27 декабря 2007 г. № 667».

3. Заявления от граждан Республики Беларусь на участие в торгах принимаются по рабочим дням с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: Витебская обл., Лепельский р-н, аг. Камень, ул. Ленинградская, 25а, Каменский сельский исполнительный комитет. **Последний день приема заявлений – 20 августа 2020 года до 17.00.**

4. Для участия в аукционе гражданину необходимо предоставить копию документа, содержащего его идентификационные сведения (без нотариального засвидетельствования); представителем гражданина – нотариально удостоверенную доверенность, а также паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, и копии платежных документов, подтверждающих уплату задатка.

Сумма задатка перечисляется до подачи заявления на расчетный счет BY89AKBB36003190600650000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, БИК банка AKBBBY2X, УНП 300594330 (УНП 300039758), код платежа – 04901. **Получатель – Главное управление Министерства финансов Республики Беларусь (Каменский сельский исполнительный комитет).**

5. Не допускается начало торгов и продажа земельного участка по начальной цене.

6. Аукцион по лоту состоится при наличии не менее двух участников.

7. В течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона победитель аукциона обязан внести плату за земельный участок, возместить расходы на публикацию в средствах массовой информации, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона.

8. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с земельно-кадастровой документацией и земельным участком на местности.

9. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории: строительство инженерных коммуникаций будет осуществлено в соответствии с проектно-сметной документацией.

Контактные телефоны: 8 (02132) 6-99-62; 8 (029) 713-99-41

УНН 100065331

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «ДОРОРС» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже имущества в составе:

Лот № 1: магазин № 50 с инвентарным номером 633/С-10565 общей площадью 66,3 кв. м, расположенный на земельном участке с кадастровым номером 624080602101000023, *(право аренды по 20.10.2110)* **площадью 0,0395 га по адресу: Минская обл., Мядельский р-н, Будславский с/с, п. Будслав.**

Начальная цена с НДС (20 %) – **9 240,00 бел. руб.** (задаток 10 % от начальной цены – **924,00** бел. руб.).

Лот № 2: магазин № 42 *(составные части и принадлежности: 2 склада)* **с инвентарным номером 633/С-10564 общей площадью 64,1 кв. м, расположенный на земельном участке с кадастровым номером 624082004601000184,** *(право аренды по 20.10.2110)* **площадью 0,0379 га по адресу: Минская обл., Мядельский р-н, Княгининский с/с, аг. Княгинин, ул. Привокзальная, 81.**

Начальная цена с НДС (20 %) – **11 640,00 бел. руб.** (задаток 10 % от начальной цены – **1 164,00** бел. руб.).

Лот № 3: здание склада *(составные части и принадлежности: цокольный этаж, пристройка)* **с инвентарным номером 600/С-161249 общей площадью 331 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 623684100001000878,** *(право аренды по 12.11.2069)* **площадью 0,1352 га по адресу: Минская обл., Минский р-н, Луговослободской с/с, 71, район, аг. Замосточье.** *Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав: охранная зона электрических сетей напряжением свыше 1000 вольт, пл. 0,0324 га.*

Начальная цена с НДС (20 %) **– 73 800,00 бел. руб.** (задаток 10 % от начальной цены – **7 380,00** бел. руб.).

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **26.08.2020** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **25.08.2020** до **16.00** по указанному адресу.

Тел.: 8 (017) 516-80-65, 516-80-64, 8 (029) 102-21-17.

Тел. для осмотра лотов №№ 1, 2: 8 029 357 90 70, по лоту № 3 – 8 029 147 00 24.

**ОАО «Гомельоблреклама»
филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона)
по поручению
ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр»
(продавец) в лице ликвидатора
ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр» –
директора ООО «Модель антикризисного управления»
Куценковой Н. С. извещает о проведении
6 августа 2020 года открытого повторного аукциона
по продаже имущества
со снижением начальной цены на 70 %
в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20**

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб.	Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб.
	Условие продажи: победитель (единственный участник) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. **Местонахождение лотов:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Школьная, д. 8		
2	Настольно-сверлильный станок ГС2116К, инв. № 61343	**1 500,00**	150,00
3	Станок 4К722АФ-1, инв. № 50372	**1 890,00**	189,00
4	Кран-балка электрическая г/п 2тн, инв. № 50132	**720,00**	72,00
5	Кран-балка, г/п 1тн, инв. № 50117	**510,00**	51,00
6	Стенд для испытаний коллектора центрального 130.00-52.00.9000, инв. № 60943	**5 010,00**	501,00
7	Котел водогрейный КВ-1, инв. № 60552	**3 690,00**	369,00
8	Толщиномер Mikrogage II, инв. № 60702	**420,00**	42,00
9	Системный блок Sempron 2.8 (констр.отдел), инв. № 60678	**66,00**	6,60
10	Платежный электронный мобильный терминал IWL.220 GPRS, инв. № 61399	**174,00**	17,40
11	Стенд для сборки двутавровых балок, инв. № 10038	**7 170,00**	717,00
12	Станок продольно-фрезерный 6М616 Ф 11.20.3, инв. № 60915	**200 130,00**	20 013,00
13	Установка для грибовидности балок, инв. № 61421	**5 250,00**	525,00
14	Блок модуля (6,0*2.4*2.5), инв. № 61351	**870,00**	87,00
15	Станов для резки брусков, инв. № 605	**99,00**	9,90
20	Профильно- шлифовальный станок 395М, инв. № 50015	**1 350,00**	135,00
22	Станок заточной ЗК-634, инв. № 50392	**390,00**	39,00
23	Станок 1В340Ф30, инв. № 50378	**2 910,00**	291,00
24	Станок 1В340Ф30, инв. № 50374	**2 070,00**	207,00
25	Станок мод.1В310Ф30, инв. № 50368	**2 910,00**	291,00
26	Станок мод.1В310Ф30, инв. № 50365	**2 490,00**	249,00
27	Станок токарно-винторезный НВ340Ф30, инв. № 50390	**2 070,00**	207,00
28	Станок ГПМ 16А20ФЗРМ-139, инв. № 50359	**2 880,00**	288,00
29	Станок ГПМ 16А20ФЗС-139, инв. № 50354	**2 070,00**	207,00
30	Станок радиально-сверлильный ГС 545, инв. № 60978	**6 150,00**	615,00
32	Станок токарно-револьверный 1П-365, инв. № 50084	**1 410,00**	141,00

Продавец: открытое акционерное общество «Жлобинский механический завод «Днепр», 247210, Гомельская область, г. Жлобин, ул. Школьная, 8. Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.: **8 (029) 303-53-09, Григорович Павел Карлович. Шаг аукционных торгов –** 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона. **Для участия в аукционе необходимо: 1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах **(задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления)**; **2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 24 июля 2020 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 4 августа 2020 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются.** Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения.
В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %.** Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **30 (тридцати) рабочих дней** и произвести оплату услуг (вознаграждение) по организации и проведению торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с «Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденное постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16 (в ред. постановления Совмина от 12.07.2013 № 607). Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от **27.09.2019 г. № 184 (29051)**. **Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».**

**Дополнительная информация
по контактным телефонам Организатора аукциона:
8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-56, 8 (029) 126-66-62**

ТЭХНАЛОГІІ

Аплата праезду анлайн. Хутка ва ўсім грамадскім транспарце Мінска

Укараніць сэрвіс ТІХ і сістэму «Аплата» ў салонах 2,5 тысячы адзінак рухомага саставу сталіцы плануюць да 1 верасня.

Пра гэта паведамляе Мінгарвыканкам у сваім афіцыйным тэлеграм-канале.

— Мы бачым, што сучасныя спосабы аплаты праезду запатрабаваныя ў гараджан, і стараемся стварыць для іх зручнасці. Абедзве сістэмы зарэкамендавалі сябе добра. Пытанне толькі ў тым, каму з пасажыраў якая зручней. Таму дадзім людзям выбар: даступныя будуць дзве сістэмы аплаты з дапамогай мабільных праграм, кожны скарыстаецца той, якая яму больш даспадобы, — кажа **намеснік старшыні Мінгарвыканкама Аляксандр ДАРАХОВІЧ**.

Як адзначылі ў выканкаме, пастаўлена задача, каб да 1 верасня аплату праезду анлайн укаранілі і ва ўсёй сетцы маршрутных таксі сталіцы.

Будзе развівацца і аплата праезду ў метро з дапамогай сканавання твару. Яе ўжо пратэсціравалі, яна працуе без збояў. У хуткім часе сістэму ўвядуць на трэцяй лініі метро, а затым распаўсюдзяць на першай і другой лініях.

Дарэчы, аплаціць праезд смартфонам ужо цяпер можна ва ўсіх сталічных трамваях: у рухомым саставе сталічных трамвайных маршрутаў укаранілі сістэму ТІХ. Магчымасць аплаты праезду смартфонам дзейнічае з 21 ліпеня.

Каб скарыстацца віртуальнай аплатай праезду, пасажыру неабходна спампаваць у GooglePlay або AppStore праграму ТІХ ды прывязаць да яе сваю банкаўскую картку: Visa, MasterCard, БелКарт. Сэрвіс прадстаўлены на рускай, беларускай, англійскай і польскай мовах.

Аплаціць білет можна проста на прыпынку, калі патрэбны транспарт яшчэ толькі пад'язджае. У праграме адлюструюцца нумар маршруту і прапанова зрабіць аплату.

Акрамя таго, у ТІХ можна набыць білет, а затым, апынуўшыся ў салоне транспартнага сродку, абраць кнопку «Аплаціць» насупраць патрэбнага нумара транспарту.

Нагадаем, з 4 мая ТІХ дзейнічае ў аўтобусных маршрутах № 1 і № 100.

НЯМА ЛЕПШАГА ЗА БРЭСТ?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Цікавым для гараджан стала відэа з вуліцы Карла Маркса, дзе мяняюць каналізацыйныя сеткі. З гэтай прычыны скарочаны маршрут тралейбусаў, яны не даходзяць да аўтавакзала і чыгуначнага вакзала. Кіраўнік горада папрасіў праявіць разуменне і паставіцца нібы да рамонту ў доме — пацярпець. Бо сеткі на гэтым участку самыя старыя ў горадзе, узведзеныя ў 1937 годзе. «Вось так труба выглядае ў свае 83 гады» — напісаў мэр і паведаміў, што рамонт скончыцца ў апошніх датах жніўня.

Да ліку эксклюзіўных навін граданачальнік аднёс з'яўленне ў мікрараёне Кавалёва падземных смеццевых кантэйнераў, якія будуць устаноўлены да зімы, а таксама ўбудаваны ў жылы дом дзіцячы садок, што з'явіцца налета ў мікрараёне Паўднёвы Усход-4. «Ведаю, наконт такога падыходу ёсць розныя меркаванні. Калі ж гэты фармат акажацца паспяховым, пабудуем яшчэ адзін на Вульцы», — рэзюмаваў аўтар уласную інфармацыю пра садок на 260 месцаў.

«А вы ведалі, што ў горадзе зарэгістраваныя 52 абшчыны 17 канфесій, і ўсе яны мірна суіснуюць?» — напісаў Аляксандр Рагачук пасля сустрэчы з прадстаўнікамі канфесій. Я, напрыклад, не ведала. І сапраўды, інфармацыя здалася даволі цікавай.

Мэр дзеліцца з падпісчыкамі паведамленнямі пра будоўлі, прадпрыемствы, установы, якія наведвае, нярэдка піша пра свае ўражанні, выказвае ацэнкі, не пазбягае эмоцый. Пры гэтым у розныя пасты не забывае ўставіць свой любімы слоган: «Лучше Бреста нету места». Такім чынам, тэлеграм-канал кіраўніка горада атрымаўся жывы, ён утрымлівае шмат карыснай інфармацыі, таму і расце колькасць падпісчыкаў. Бо паведамленні з першых вуснаў нярэдка падштурхоўваюць да абмеркавання навін і падзей гараджанамі, выказванні сваёй пазіцыі па закранутых тэмах на розных пляцоўках, што служыць стымулам для далейшага развіцця горада.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

ПРЫЕМНАЯ НАВІНА

НАВАСЕЛЛЕ ДЛЯ ШМАТДЗЕТНЫХ

У Слуцку практычна вырашана пытанне забеспячэння жыллём гэтай катэгорыі грамадзян

Трыццаць дзевяць кватэр атрымалі шматдзетныя сем'і ў Слуцку. 40-кватэрны дом пабудавалі спецыяльна для тых бацькоў, якія выхоўваюць трох і больш дзяцей. Пяціпавярховік знаходзіцца ў маладым і перспектыўным мікрараёне Чэхава. У доме толькі двухпакаёвыя і трохпакаёвыя кватэры. Ключы ад новага жылля навасёлам уручыў намеснік старшыні Мінаблвыканкама Іван МАРКЕВІЧ.

Жыллё будавалася з улікам сучасных тэндэнцый. Кожны жыхар можа зрабіць рамонт на свой густ — падабраць шпалеры, вырашыць, у якіх колерах і тонах афарміць пакоі, устанавіць хатняе абсталяванне.

Старшыня Слуцкага райвыканкама Андрэй ЯНЧЭЎСКІ адзначыў, што паўтара года таму кіраўнік дзяржавы даў даручэнне, каб шматдзетныя сем'і не стаялі ў чарзе больш за год з моманту пастаноўкі на ўлік. У Слуцку гэтае даручэнне практычна выканалі. З пачатку года атрымалі жыллё 139 сем'яў. Да канца 2020-га будуць забяспечаны сваім кутком яшчэ 290.

— Як толькі сям'я прыходзіць у райвыканкам для пастаноўкі на ўлік, атрымлівае статус шматдзетнай, мы адразу ж накіроўваем яе на будаўніцтва жылля. Яна не чакае не тое што год — ні дня, — падкрэсліў Андрэй Янчэўскі.

Іван Маркевіч дадаў, што ўсяго на Міншчыне налічваецца 18 500 шматдзетных сем'яў, у паляпшэнні жыллёвых умоў маюць патрэбу 8500. З кожным годам іх колькасць павялічваецца. А гэта значыць, што галоўны рухавік шматдзетнай сям'і — жыллё.

Варта адзначыць, што апошнім часам у Слуцку квадратныя метры ўзводзяцца актыўна. І не толькі для шматдзетных. Цяпер забудоўваецца другая частка мікрараёна Чэхава. Тут мяркуецца ўзвесці шэсць дамоў для трохсот сем'яў.

У 2021 годзе пачнецца будаўніцтва сямі дамоў на 530 кватэр каля вуліцы Барысаўца, дзе раней быў пустыр. Плануецца, што стаянкі тут будуць размешчаны не ўнутрыдамавой тэрыторыі, а ўздоўж вуліц. У дварах уладкуюць дзіцячыя, спартыўныя пляцоўкі, веласіпедныя дарожкі.

Дададзім, што ў Слуцку шмат увагі ўдзяляюць і ўзвядзенню дамоў у раёне індывідуальнай забудовы.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15
ад 17 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**
Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

**Дырэктар — галоўны рэдактар
СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**

Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by **(для зваротаў):** zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 287 18 31;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 14.804. **Нумар падпісаны ў 19.30 23 ліпеня 2020 года.**